№ 7(37)/2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, ліпень–жнівень 2001 г.




## БЕЛАРУСКІ ВЫБАР

*(Заява)*

Структурамі рэжыму вызначаныя чатыры прэтэндэнты для ўключэньня ў бюлетэнь для галасаваньня 9 верасьня 2001 г. Усе гэтыя асобы з'арыентаваныя на Маскву і залежныя ад яе. Таму пэрсанальны склад кандыдатаў цалкам задавальняе Маскву.

Крэмль трымае пад кантролем ня толькі рэжым Лукашэнкі. Пры спрыяньні некаторых заходніх дыпляматаў, у першую чаргу намаганьнямі Г.Г.Віка, Расеі ўдалося рэанімаваць кебічаўскую намэнклятурную групоўку і сфармаваць зь яе апазыцыю Лукашэнку.

Ачольваць групоўку намэнклятурных „апазыцыянэраў" былі прызначаныя **У**.**Ганчарык** і **С**.**Домаш**, што раз за разам езьдзяць у Маскву, каб зь яе дапамогаю зноў вярнуцца ва ўладу, абяцаючы за гэта зрабіць саюз Расеі і Беларусі яшчэ шчыльнейшым, чым пры Лукашэнку. Такім чынам, пры іх пасярэдніцтве ў Беларусі ствараюцца ўмовы „кіраванага палітычнага канфлікту" з боку Масквы.

За гады рэжыму Лукашэнкі ўлада ў Беларусі захопленая **расейцамі-функцыянэрамі КГБ**, генэраламі ды палкоўнікамі, што прыехалі з Расеі. Гэты прамаскоўскі акупацыйны рэжым мэтадычна здушвае і разбурае ў Беларусі ўсё беларускае: мову і культуру, школу і дзяржаўныя інстытуты ўлады, эканоміку і прадпрымальніцтва. Зь беларускага

дзяржаўнага пасаду былі незаконна і гвалтоўна зрынутыя нацыянальныя сімвалы — *гэрб Пагоня* і *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*.

Вынікам кіраваньня Лукашэнкі ёсьць катастрафічнае сацыяльнае зьбядненьне народу — большасьць жыхароў краіны знаходзіцца за рысаю пражытковага мінімуму, а працоўная дзейнасьць сучаснага беларуса дазваляе яму толькі выжываць. А тым часам у структурах улады праводзіцца схаванае ад насельніцтва пераразьмеркаваньне нацыянальнай маёмасьці на карысьць расейскіх палітыкаў і алігархаў.

Галоўная мэта рэжыму — зьнішчэньне незалежнасьці і дзяржаўнасьці Беларусі, поўны захоп нацыянальнай маёмасьці і пераўтварэньне нашай краіны ў рэгіён расейскай імпэрыі. І ўсё гэта рабілася і робіцца са згоды Лукашэнкі. Таму вернутая на палітычную арэну старая кебічаўская намэнклятура, якая хоча вярнуцца ва ўладу, каб працягваць палітыку, якая рабілася пры Лукашэнку.

Як саюзьнік і дублёр А. Лукашэнкі выступае ў гэтай выбарчай кампаніі **С.Гайдукевіч**, які ўключаны ў такі сцэнар маскоўскімі паліттэхнолягамі.

Намэнклятурнае ўтварэньне Ганчарык-Домаш пад шыльдай „адзіны кандыдат" ад гэтак званай „аб'яднанай апазыцыі" — ня ёсьць альтэрнатыва прамаскоўскай палітыцы А.Лукашэнкі. Галоўная мэта яго ўдзелу ў выбарчай кампаніі — здабыцьцё ўлады ў Беларусі з дапамогаю Масквы і пераразьмеркаваньне маёмасьці на карысьць сваіх гаспадароў. Відавочна, што „адзіны кандыдат" не зацікаўлены ў правядзеньні палітычных і эканамічных рэформаў на карысьць беларускага народу. Яму давядзецца спраўджваць інтарэсы маскоўскіх фінансавых і палітычных куратараў ды беларускай былой камуна-савецкай намэнклятуры.

Камуністычна-савецкая намэнклятура сабе на службу падабрала палітыкаў, якія ў 1999 годзе адракліся ад нацыянальнай ідэі і адышлі ад нацыянальна-вызвольнай барацьбы ў вікаўскую „аб'яднаную дэмапазыцыю". Ёй на ўслужэньне трапіла і частка нацыянальна сьведамых людзей, падманутых псэўдадэмакратычнай фразэалёгіяй. Зараз увесь запас аргумантаў яны ськіроўваюць на апраўданьне свайго пасьпешнага перамяшчэньня ў штаб кіраўніка „школы камунізму" У.Ганчарыка. І ў гэтую палітычную багну яны зацягваюць сваіх прыхільнікаў.

У гэтых умовах *Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* заклікае грамадзянаў Беларусі ісьці на выбары 9 верасьня 2001 года. ***Трэба ў першым і другім туры прагаласаваць супраць усіх асобаў, уключаных у бюлетэнь***. Тады ніхто ня будзе абраны і, паводле дзейнага выбарчага заканадаўства, на працягу трох месяцаў ***мусяць адбыцца паўторныя выбары***. Узьнікнуць новыя ўмовы для выбараў, таму што Лукашэнка ў гэты пэрыяд (з 27 лістапада 2001 г.), па ягонай канстытуцыі, траціць паўнамоцтвы. На паўторныя выбары будуць выстаўленыя новыя, беларускія кандыдаты.

Гэта правільнае і неабходнае дзеяньне, у ім сутнасьць беларускага выбару. У гэтым — адстойваньне ***Беларускай Незалежнасьці, Беларускага Адраджэньня***. Гэта забясьпечвае палітычную пэрспэктыву беларускай нацыі.

*18 жніўня 2001 г* ***(Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

# ПАЛІТЫЧНАЯ ПАЗЫЦЫЯ

## *Аб агітацыі „супраць" на выбарах прэзыдэнта*

*(Пастанова)*

*Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* і *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* ацэньвае абставіны, што склаліся на выбарах прэзыдэнта Беларусі, як неспрыяльныя для будучыні краіны. Усе асобы, зарэгістраваныя кандыдатамі на прэзыдэнта, вызначаюцца прамаскоўскай арыентацыяй, адкрыта гэтую пазыцыю і свае сувязі з маскоўскімі кіруючымі палітыкамі дэманструюць і заяўляюць у розных формах аб сумеснай палітыцы і залежнасьці Беларусі ад Расеі. Яны выкарыстоўваюць дзяжурную дэмагогію, абяцаньне стварыць умовы для беларускай культуры ды сымволікі — пусты гук, намэнклятурныя абяцанкі, якія ніколі не выконваліся.

Фактычна, беларусы ня маюць выбару, бо ўсе кандыдаты нацэленыя на залежнасьць ад чужой дзяржавы і на падтрымку яе інтарэсаў у Беларусі.

Пэўныя дыпляматычныя і палітычныя групоўкі імкнуцца зьмяніць Лукашэнку на больш ляяльнага да Захаду і больш паслухмянага і прадказальнага для Масквы прадстаўніка былой камуністычнай намэнклятуры.

Выбраньне на прэзыдэнта такога прадстаўніка былой камуністычнай намэнклятуры спарадзіла б пустыя ілюзіі ў грамадстве, а на справе — забясьпечыла б працяг маскоўскай каляніяльнай палітыкі на Беларусі і ў выніку — страту нацыянальнай маёмасьці, фінансавай сістэмы і дзяржаўнай незалежнасьці нашай краіны.

У сувязі з абставінамі, якія склаліся на выбарах прэзыдэнта Беларусі, Сойм пастанаўляе:

усім сябрам і арганізацыям *Партыі БНФ* і *Фронту*:

**1.** Прыняць удзел у агітацыйнай кампаніі супраць усіх прамаскоўскіх кандыдатаў у прэзыдэнты Беларусі, каб не дапусьціць іхняга абраньня, з мэтай стварэньня ўмоваў для паўторных выбараў прэзыдэнта.

**2.** Заклікаць выбаршчыкаў галасаваць супраць усіх кандыдатаў (у першым і другім туры), зьмешчаных у бюлетэні.

**3.** Наладзіць грамадзка-партыйны кантроль за галасаваньнем у першым і другім туры выбараў.

Арганізацыя агітацыйнай кампаніі ***„Супраць"*** і наладжаньне кантролю за галасаваньнем ускладаецца на кіраўніцтва *Партыі* і *Фронту* і *Управу Партыі БНФ*.

У выпадку, калі ў выніку выбараў будзе абвешчаны прэзыдэнтам грамадзянін Лукашэнка альбо любы прадстаўнік апаніруючай яму намэнклятуры (У. Ганчарык, С. Домаш), *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* і *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* адразу ж ***становяцца ў апазыцыю да новаабранай прэзыдэнцкай улады***, будуць адстойваць незалежнасьць Беларусі, змагацца супраць уцягваньня Беларусі ў склад Расеі.

*18 жніўня 2001 г.* ***(Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***
*Менск*

# ЛІСТЫ ПРА ВЫБАРЫ

## *1.Бог, Беларусь, Незалежнасьць*

*(Вытрымкі)*

...Цяпер найбольш блытаюць людзей так званая „незалежная" прэса і тыя асобы, якія выступаюць супраць Лукашэнкі, але згаджаюцца і калябаруюць з Масквой. Яны лётаюць у Маскву і просяць маскоўцаў: дапамажыце зьмяніць Лукашэнку, падтрымайце нас, мы будзем лепей вам служыць. Яны просяць у Масквы дапамогі. Але чым яны будуць зь ёй потым разьлічвацца? Такія „палітыкі-гандляры" прададуць Беларусь гэтак жа, як і Лукашэнка (яшчэ й хутчэй).

...Пазыцыі палітыкаў у беларускіх выбарах (падкрэсьліваю, *у выбарах*) вызначаюцца не па дачыненьнях да Лукашэнкі, а па дачыненьнях да „інтэграцыі" („саюзу") з Расеяй. Трэба разумець, што ў дачыненьнях да Лукашэнкі вырашаецца лёс прэзыдэнцкай улады. У дачыненьнях да „інтэграцыі" з Расеяй ***вырашаецца лёс беларускай нацыі***. Таму чалавек, які на прэзыдэнцкіх выбарах будзе змагацца з Лукашэнкам і адначасна выступаць за „інтэграцыю" з Расеяй, ня ёсьць альтэрнатывай Лукашэнкі, а толькі апанэнт-дублёр маскоўскай нэакаляніяльнай палітыкі.

Людзі, што супраць Лукашэнкі і за „інтэграцыю" з Расеяй, былі

нашымі саюзьнікамі ў палітычнай барацьбе з рэжымам (бо ў барацьбе не існавала выбару). На прэзыдэнцкіх выбарах гэтыя людзі ў якасьці кандыдатаў на прэзыдэнта Беларусі ўжо *ня ёсьць і ня могуць быць* нашымі саюзьнікамі. Гэта нашыя палітычныя праціўнікі, супраць якіх мы змагаемся за лёс Беларусі. Гэта ёсьць закон палітыкі. ***Выбар адбываецца па вышэйшай неабходнасьці***.

...Я ўжо пісаў пра радыё „Лібэрці". Ня майма наконт яго ілюзіяў. Хоць там ёсьць яшчэ прыстойныя людзі і сьведамыя беларусы, але яны ўжо мала што вызначаюць і ў большай частцы, — гэта ўжо не адраджэнскае радыё. Людзі ў Беларусі, нацыянальна-вызвольная моладзь ужо даўно перарасьлі ягоны ўзровень. Не ўспрымайма ягоныя палавіністыя камэнтары палавіністых камэнтатараў як праўду ў апошняй інстанцыі. Некаторыя зь іх сьведама хлусяць, а некаторыя — не арыентуюцца.

Успомніце 1999 год, як радыё „Свабода" адлюстроўвала палітычную афёру па зьнішчэньні *Беларускага Народнага Фронту* — так званы „праект Чыгір". Успомніце, як экзальтавана, узахлёб, да самазабыцьця хлусілі ў эфір некаторыя „прафэсійныя" журналісты пра быццам бы мільёны прагаласаваўшых на „альтэрнатыўных" выбарах прэзыдэнта, як узьвялічвалі „рэвалюцыю" ў *Фронце*, як уздымалі ўгару вялікую „новую хвалю", новых стодаляравых „палітыкаў" і г.д. Дзе цяпер гэтая „хваля" і гэтыя вялікія „новыя палітыкі", і гэтыя журналісты са „Свабоды"?!

...Нас нічога не павінна бянтэжыць, ніякая супраць нас пісаніна, ніякае друкаваньне, ніякая прапаганда, ніякі радыё-эфір. (Пра афіцыйнае радыё, тэлебачаньне і газэты я ўжо і не кажу.) Мы мусім разумець, што гэтак робіцца, незалежна ад нас. Мы мусім ацэньваць усё з пазыцыяў вышэйшасьці нашага разуменьня і спакойна рабіць сваю справу далей.

У беларусаў зьявілася рэальная магчымасьць дапамагчы самым сабе выйсьці з заганнага каляніяльнага кола падзей. Мы ня маем права такую магчымасьць змарнаваць. На плечы кожнага з нас кладзецца вялікая нагрузка і вялікая адказнасьць, бо важыцца лёс Беларусі.

*(24 чэрвеня 2001 г.)*

## *2. Выбару няма*

Прайшоў пэўны час ад заканчэньня збору подпісаў у выбарчай кампаніі, і сітуацыя, ня гледзячы на тое, што афіцыйна вынікі яшчэ не падведзеныя, ужо, практычна, вызначаная.*

Для Беларусі выбару няма. Альбо зноў прамаскоўскі Лукашэнка, альбо ягоныя прамаскоўскія намэнклятурныя супернікі (што можа стаць яшчэ горай).

Створана такое ж становішча, як у 1994 годзе. Толькі цяпер у беларускага грамадзтва ёсьць вопыт сямігадовага ашуканства і прыніжэньня. Ці будзе зробленая з гэтага нармальная і пасьлядоўная выснова, — казаць яшчэ рана, улічваючы, што ўся так званая гэбоўска-вікаўская „дэмакратычная" прапаганда штурхае беларусаў зноў паўтарыць памылку і зноў галасаваць за іншага маскоўскага калябаранта. Сітуацыя клясычна каляніяльная: выбары бяз выбару. Выбар марыянэткі.

Як і ў 1994 годзе, *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* павінен заклікаць беларускіх выбаршчыкаў ***ісьці на галасаваньне, каб выкрэсьліць усіх***. Гэта правільнае і неабходнае дзеяньне.

Выбарчая сітуацыя абмяркоўвалася 4-га жніўня на Паліткамітэце *Фронту* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* у Варшаве. Паліткамітэт лічыць неабходным і прапануе прыняць менавіта такое, адзінае ў гэтай сітуацыі, пэрспэктыўнае для Беларусі рашэньне: перакрэсьліць пры галасаваньні ўвесь намэнклятурна-каляніяльны бюлетэнь.

Аналізуючы дачыненьні, намі асабліва была зьвернута ўвага на разбуральніцкую ролю **Ганса-Георга Віка**, які зьяўляецца куратарам нямецка-маскоўскага „другога варыянту" (замена Лукашэнкі на прамаскоўскую намэнклятурную фігуру) і асабліва — на падстаўную ролю М. Домаша. Ролю найбольш нікчэмную ў гэтай кампаніі, прадугледжаную і адпаведным чынам падтрыманую Г. Вікам дзеля нэўтралізацыі беларускіх нацыянальна-вызвольных сілаў.

Сітуацыя наглядна ілюструе, у якое балота трапілі асобы, якія з 1999 года адышлі ад нацыянальна-вызвольнай барацьбы ў вікаўскую „аб'яднаную дэмапазыцыю". Зараз увесь запас выдумкі яны накіроўваюць на прыдумваньне „канцэпцыяў" і апраўданьне свайго становішча на службе ў намэнклятурнай „пяцёркі" ды працы на намэнклятурнага камуніста У. Ганчарыка (што з Масквы не вылазіць). І гэта яшчэ не фінал і, відаць, не мяжа такіх паводзінаў.

Цяпер кожнаму становіцца відавочным, што нямецкая пазыцыя ў дачыненьні да Беларусі на Захадзе ўзмацнілася, і Беларусь, фактычна, запрададзена. У Эўропе поўна заяваў, нібы напісаных пад нямецкую капірку, што, маўляў, „ня важна, каго выбяруць", а важна, „як" будуць выбіраць. А на пытаньне „як", будзе адказваць Ганс Вік. Лукашэнка ведае, што калі ён акуратна правядзе фальсіфікацыю, то Вік яе не заўважыць, і Эўропа Лукашэнку прызнае.

Улічваючы нямецка-маскоўскі гешэфт, прапанаваная намі пазыцыя выкрэсьліваць абодвух іхных кандыдатаў ёсьць для беларусаў адзіна пэрспэктыўнай.

Верагоднасьць, што за вельмі кароткі тэрмін можна давесьці да грамадзтва нашу задачу і тое, што грамадзтва гатовае яе ўспрыняць, — невялікая, але яна ёсьць.

Мы павінны памятаць, што палітычны працэс змаганьня за свабоду і незалежнасьць Беларусі ня скончыцца ў верасьні. Ён будзе працягвацца. І нават калі б нам не ўдалося цяпер пераканаць грамадзтва ня лезьці ў чарговы маскоўскі загон, то ў будучыні (і вельмі хутка) наша пазыцыя шматкроць павялічыць нашыя сілы.

Хвала тым, хто стаіць за свой народ!

*(6 жніўня 2001 г.)*

---

* Тое, што замест запляналаваных намі 150 тысячаў подпісаў (як меркавалася) мы сабралі толькі 104600 подпісаў, стала рашаючым чыньнікам у адносінах да нас з боку афіцыёзу (безапэляцыйная нерэгістрацыя) і вызначыла таксама нашую пасыўную рэакцыю ў адказ, на якой я асабіста настаяў.

Бо мы ня можам у гэтых варунках прад'яўляць прэтэнзіі з пазыцыі сілы. Нельга з такім „запасам" пускацца ў дробязныя высьвятленьні і спрэчкі зь непрыхільнай і абсалютна некантралюемай уладай (выбарчымі камісіямі), ставіць сябе ў становішча малога і пакрыўджанага. Мы змарнавалі б час на пустое, нічога б не дамагліся і не прыдбалі б гонару.

Неразумныя, дробязныя паводзіны Л. Сініцына (а я не сумняваюся, што ён сабраў свае 110 тысячаў) ёсьць выразная ілюстрацыя да маіх словаў. (І гэта улічваючы, што за „птушка" Сініцын.)

Што датычыць нашых унутраных прычынаў „невыкананьня намечанага пляну" (150 тысячаў подпісаў), то да канца выбарчай кампаніі (у якой мы мусім удзельнічаць) высьвятляць гэтае пытаньне і шукаць вінаватых немэтазгодна і ня трэба. Пазьней мы яшчэ вернемся да яго і прааналізуем свае памылкі і пралікі.

## *3. Трэба рыхтаваць паўторныя выбары прэзыдэнта*

У Беларусі пачаліся выбары прэзыдэнта. Гэта выбары ва ўмовах дыктатуры і антыбеларускіх дзеяньняў чужароднай улады.

Сітуацыя з кандыдатамі ў прэзыдэнты Беларусі выразна акрэсьлілася. Для беларусаў яна вельмі некарысная. ***Як і ў 1994-м годзе, для беларусаў выбару няма.*** Выбіраць няма каго, бо ўсе кандыдаты прамаскоўскай арыентацыі. Усе гатовыя падтрымліваць на Беларусі расейскую каляніяльную палітыку. Гэта былая камуністычна-гэбоўская намэнклятура, якая падзялілася на пары і супернічае паміж сабой. З аднаго боку Лукашэнка-Гайдукевіч, з другога — Ганчарык-Домаш. У выпадку выбраньня любога зь іх застаецца існаваць антынародны рэжым, яго сьціраванасьць на Расею і залежнасьць ад антыбеларускай палітыкі Масквы.

Такую самую камбінацыю прыдумалі беларусам у 1994-м годзе, калі ў другім туры выбараў прапанавалі выбіраць паміж Кебічам і Лукашэнкам (паміж чартом паленым і чартом смаленым). Беларусы і „выбралі"!

А трэ' было перакрэсьліць абодвух.

Тады, 7 гадоў таму, я выступіў ад імя *Беларускага Народнага Фронту*

*„Адраджэньне”* са спэцыяльнай заявай, якая была зьмешчаная ў друку.

*“У другі тур прайшлі А. Лукашэнка і В. Кебіч,* — пісаў я тады. — *Гэтыя кандыдаты належаць да аднаго палітычнага асяроддзя. Іх яднае нянавісьць да беларускага нацыянальнага адраджэньня, да незалежнага дзяржаўнага станаўленьня нашай нацыі, да рынкавага рэфарматарства, да беларускай культуры, да эўрапейскага шляху разьвіцьця Беларусі.*

*Іх разьядноўвае — барацьба за ўладу. Гэта барацьба падобных. Змагаючыся, яны апэлююць да народу.*

***Мае аднадумцы і я заклікаем не галасаваць на выбарах за гэтых кандыдатаў. Выбар аднаго зь іх стане працягам ганебных памылак і грамадзкага няшчасьця, прадаўжэньнем народнага самагубства.*** *Галасаваньне за гэтых людзей увогуле трацiць сэнс, бо выбару няма.” (Беларус, — 1994, №414)*

Што адбылося потым, гісторыя сьведчыць жорстка і вельмі выразна (так, як і было папярэджана). Я цытую тут гэтыя свае словы з поўным усьведамленьнем годнасьці, але не для таго, каб нейкага дакараць, а каб яшчэ раз нагадаць, што ў палітыцы заўсёды трэба тое рабіць, што трэба рабіць, а ня тое, што хочацца. Бо расплата можа быць вельмі суровай.

Цяпер, у 2001 годзе, беларусам нельга наступіць на тыя ж граблі, нельга зноў лезьці ў маскоўскую пастку.

Цяперака трэба выкрэсьліць усіх прамаскоўскіх кандыдатаў: і Лукашэнку, і Ганчарыка, і Домаша, і Гайдукевіча. Памятайма, што ***і ў першым, і асабліва ў другім туры галасаваньня, трэба будзе перакрэсьліць усіх***.

Што мы дасягаем такім дзеяньнем? Гэтым мы дасягаем таго, што ў верасьні ніхто ня будзе абраны на прэзыдэнта і праз тры месяцы мусяць адбыцца паўторныя выбары з новымі, беларускімі кандыдатамі.

Што гэта дасьць? Гэта дасьць рэальныя пэрспэктывы абраць сапраўды беларускага прэзыдэнта і скончыць з рэжымам.

Па-першае, Лукашэнка на паўторныя выбары вымушаны тады йсьці „аслабленым”, асобай, якая ня выйграла, маючы неабмежаваную ўладу.

Па-другое, Лукашэнка, які з 21 ліпеня 1999 года зьяўляецца нелегальным кіраўніком і ўзурпатарам улады перад народам, становіцца неўзабаве нелегітымным і перад самым сабой, і перад рэжымам, які ён стварыў, бо ў канцы лістапада канчаецца тэрмін ягоных паўнамоцтваў па ягонай канстытуцыі, якую ён прыдумаў са спадаром Абрамовічам. Месца кіраўніка краіны, згодна з гэтай канстытуцыяй, павінен часова заступіць старшыня Саўміна спадар Ярмошын.

Такім чынам ствараюцца новыя ўмовы для выбараў.

Па-трэцяе, за гэты час будуць выстаўленыя новыя, беларускія кандыдаты, і грамадзтва набудзе пэўны вопыт, каб не ўспрымаць усур’ёз розную нафталінавую намэнклятуру, усялякія „пяцёркі”, „сямёркі”, „двойкі” ды „адзінкі” з членаў боро ЦК КПБ.

Я зьвяртаюся, перш за ўсё, да беларускай грамадзкай эліты і моладзі, бо ад эліты найперш залежыць, як будзе галасаваць электарат. Нельга жыць у стане пэрманэнтнага самаашуканства. Калі эліта зноў паўторыць памылку 1994 года, то псіхалягічна можа заламацца ўся нацыя. Бо паўторнае „выбраньне” Лукашэнкі, якое прызнае Эўропа (а яна рыхтуецца прызнаць), стане фатальным для Беларусі.

Выбар жа намэнклятурнага „нелукашэнкі” ў дадзеным раскладзе можа стаць у пэрспэктыве яшчэ горшым, чым электаральная катастрофа і выбар 1994-га года.

Эліта не павінна забываць, што за раскладам выбару прэзыдэнта, які створаны цяпер у Беларусі, стаяць агульныя нямецка-маскоўскія інтарэсы і рэальна адсутнічаюць інтарэсы беларускія.

Калі беларусы зноў выберуць каляніяльную крэатуру маскоўскай палітыкі (а іншых сярод кандыдатаў няма), то ў пэрспэктыве мы страцім нацыянальную маёмасьць, валюту і, як вынік, — дзяржаўную незалежнасьць. (Схема ўжо закладзеная рэжымам Лукашэнкі.) Тады ўсе палітычныя і сьветапоглядныя разыходжаньні ў беларускім грамадзтве ня будуць мець аніякага значэньня. Страцяць усе. І страта будзе катастрафічнай і для тых, хто за Беларускую мову і Беларускі сьцяг, і для тых, хто супраць. Бо ў сэнсе нацыянальнага існаваньня народа ёсьць толькі адзін выбар: адна мова, адна краіна, адна незалежнасьць. Двух нацыянальных выбараў не бывае і не існуе, як не існуе двух жыцьцяў.

Выглядае, што гэтага, на жаль, ня ведае большыня цяперашняй эліты беларускага грамадзтва. І ў гэтым — крыніца ўсёй беларускай бяды.

Што датычыць моладзі, якая па прыродзе сваёй заўсёды жыве больш сэрцам, чым выгадай, то сэрца трэба адчыняць для Беларусі. Галасаваць трэба так, каб не было потым пакутліва сорамна, каб ня мучыла сумленьне, як тых, каму ў 1994-м годзе не хапіла элемэнтарнага ўяўленьня і, каб не прапусьціць Кебіча, яны галасавалі за Лукашэнку.

Магчымыя чатыры варыянты разьвязкі на выбарах.

Першы варыянт: Лукашэнка фальсіфікуе, выйграе, і яго прызнае міжнародная супольнасьць.

Другі варыянт: выйграе намэнклятурны „нелукашэнка”, і яго прызнае міжнародная супольнасьць.

Трэці варыянт: Лукашэнка фальсіфікуе, выйграе, але Захад не прызнае выбары за справядлівыя.

Чыцьвёрты варыянт: не выйграе ніхто, і прызначаюцца паўторныя выбары.

Варыянты названыя па парадку небясьпечнасьці для Беларусі. Першы варыянт мы разглядаем як фатальны для ўсёй нацыі, які будзе суправаджацца шокавым стрэсам.

Другі варыянт — самазабойчы для Беларусі, які будзе суправаджацца грамадзкім расслабленьнем, пустымі надзеямі і ілюзіямі пераменаў, хоць, у прынцыпе, не адбудзецца ніякіх пераменаў у галоўных аспэктах эканамічнай, фінансавай, ваеннай, культурнай і ўвогуле — нацыянальнай палітыкі, ужо спраектаванай існуючым рэжымам. Ня будзе адменена нават лукашэнкаўская канстытуцыя — аснова рэжымнай сістэмы. Нэакаляніяльная акупацыя Беларусі, з прычыны ілюзіяў, псіхалягічнай і палітычнай раззброенасьці грамадзтва, пойдзе хуткімі тэмпамі.

Трэці варыянт можна разглядаць як вельмі небясьпечны, але часовы і палітычна недаўгавечны. Бо застанецца нелегальнасьць вышэйшай улады, захаваецца канфліктная раскладка сілаў, павялічыцца апаніруючая частка, узмоцніцца палітычны падзел у грамадзтве, у сістэме ўлады і ў міжнародных дачыненьнях. Узмоцніцца ўнутраная ізаляцыя Лукашэнкі. Няўстойлівасьць такога рэжыму можа штурхнуць яго на экстрэмісцкія дзеяньні супраць беларусаў, але можа таксама павялічыць шансы беларусаў на перамогу і перамены ў беларускіх інтарэсах.

Толькі чацьвёрты варыянт дае надзею і можа адчыніць пэрспэктыву для Беларусі. Яму не хапае, на жаль, належнага інфармацыйнага забесьпячэньня.

Інфармацыйнае поле ў асноўным занятае цяпер агітацыяй за Лукашэнку. Аднак найбольш падступная прапаганда вядзецца якраз вакол вікаўскага „другога варыянту” ў асяроддзі рускамоўнага так званага „незалежнага” друку і „дэмакратаў”.

Агітацыя за старую камуністычную намэнклятуру абгрунтоўваецца тут нібыта „неабходнасьцю” (?) пераходнай фігуры, нібыта прымальнай для „ўсіх” (?). Намэнклятурны „нелукашэнка” правядзе, маўляў, дэмакратычныя парляманцкія выбары, і яны, „дэмакраты”, трапяць у парлямант (палату) і стануць на ўзроўні ўлады далей, крок за крокам, змагацца за дэмакратыю.

Гэтакімі вось „ідэямі” тлумяць мазгі беларускай моладзі.

Усе абяцаньні намэнклятуры — пусты гук. Пакуль старая савецкая намэнклятура будзе трымаць уладу ў Беларусі, яна ніколі не адмовіцца (нават часткова) ад мажарытарнай сістэмы, якая забясьпечвае ёй татальную перавагу на выбарах. І усё зробяць „дэмакратычна” (пад „віват” Захаду).

Цяперашнія „дэмакраты” — гэта камуніст С. Калякін (які адобрыў будаўніцтва дарогі праз Курапаты), генэрал П. Казлоўскі (які выганяў зь беларускага войска беларускіх афіцэраў), былы член бюро ЦК КПБ У. Ганчарык, былы старшыня Аблвыканкаму С. Домаш, былы

лукашэнкаўскі прэм'ер М. Чыгір (абвінавачаны ў карупцыі С. Антончыкам), былы лукашэнкаўскі міністар М. Марыніч, генэрал КГБ В. Кез і г.д. (уся былая камуністычна-гэбоўская намэнклятура) — сьвяткуюць „сьвята" „демократического единения". *„Мы павінны пабудаваць на Беларусі дэмакратычную дзяржаву",* — кажуць яны (С. Домаш).

Зусім нядаўна гэтыя ж самыя асобы будавалі *„на Беларусі"* „камунізм", потым — „разьвіты сацыялізм", потым — „перестройку", затым — „інтэграцыю" разам з Лукашэнкам, цяпер зьбіраюцца будаваць „дэмакратыю" (абы ўлада!). І ўсё — *„на Беларусі".* Але ніхто зь іх ніколі не будаваў, ня хоча і ня здольны будаваць саму Беларусь. Гэта супярэчыць іхняй псіхалёгіі.

Сэрвільная журналістыка „незалежных" мэдыяў пляскае ў ладкі гэтай „дэмакратыі" і робіць выгляд, што ня бачыць, што адбываецца. Праўда, адзін з усёй гэтай пішучай „роты" сарамліва заўважыў: *„Напрыканцы хацелася б пажадаць нашым паважаным дэмакратам адну „дробязь" — перакласьці, нарэшце, на беларускую мову папярэдні слёган адзінага кандыдата „В единстве — сила".* (Але навошта? Можа, ня трэба? Так жа лепей. Памятаеце: „Партия и народ — едины".)

Намэнклятура прыстасоўваецца, але не зьмяняецца. „Пагадненьне" між сабой, якое яны нядаўна падпісалі, складзена па ўсіх штампах савецкай каляніяльнай вывучкі. Яны ўжо дзеляць уладу, якой яшчэ не загарнулі (куча расьце). І толькі ў самым канцы паперкі (усё, як некалі) напісана адчэпнага пра культуру ды мову. Маўляў, *„стварыць спрыяльныя ўмовы для разьвіцьця нацыянальнай культуры, мовы, традыцыяў і ўжываньня нацынальнай, гістарычнай сымволікі беларускага народа".* (Маўляў, вяртаемся да Кебіча. Каза з дому — жыць лягчэй.) Дарэчы, так фармулююць, калі гавораць пра нацыянальныя мяншыні.

*"Узяць курс на забесьпячэньне дынамічнага разьвіцьця эканомікі, —* пішуць гэтыя „дэмакраты", — *на ўздым жыцьцёвага ўзроўню насельніцтва."* Як бачым, „курс" амаль ленінскі. Як гэта ўсё знаёма, гэтыя фразы і гэтая пустапарожнасьць. „Верной дорогой идете, товарищи!"

Пустыя абяцанкі намэнклятуры ня вартыя выедзенага яйка. Яны ніколі не выконваліся і ня будуць выконвацца. Бо ёсьць інтарэсы намэнклятуры. (Успомніце абяцанкі Кебіча, Лукашэнкі і г.д.) У Беларусі цяпер мы назіраем пад выглядам і пад шырмай дэмакратыі спробу вяртаньня „бурбонаў". Бурбонаў старой камуністычнай (кебічаўскай) намэнклятуры.

Няўжо беларусы і цяпер ня ўбачаць, не зразумеюць, хто шчэміцца, хто хоча на іхных плячах вярнуцца ва ўладу, каб зноў павесьці народ „правільным курсам" у маскоўскую яму?!

У беларускага грамадзтва ёсьць дастатковы вопыт, каб разумець, што такое ўлада савецкай прамаскоўскай намэнклятуры, як яна дасягаецца, функцыянуе і ўтрымліваецца, якія могуць быць вынікі гэтай улады і наступствы для Беларусі. Гэта ўсім зразумела. Але трэба дзейнічаць. Дзейнічаць рашуча і разам. Адкінуць усю лукашэнкаўскую і ўсю „дэмакратычную" дэмагогію намэнклятуры. Бо, як кажа наша беларуская моладзь, ***Беларусь— гэта сьвятое***.

Якім чынам можна засьцерагчыся цяпер (практычна, за тры тыдні да выбараў) ад дэмакратычнай дэмагогіі і ад ганебнага становішча, у якое зноў заганяюць беларусаў?

Мы можам супрацьпаставіць гэтаму нашу Беларускую Салідарнасьць у абароне асноўных беларускіх каштоўнасьцяў: *мовы, незалежнасьці, нацыянальнай маёмасьці*. Усе беларусы, незалежна ад поглядаў і якіх бы там ні было прыхільнасьцяў, могуць салідарызавацца ў абароне асноўных здабыткаў нацыі. Гэта натуральна і ў гэтым наша нявыкарыстаная сіла.

Я зьвяртаюся да ўсіх грамадзянаў Беларусі, і перш за ўсё, да таго мільёна выбаршчыкаў-беларусаў, якія падтрымалі мяне на першых прэзыдэнцкіх выбарах у 1994 годзе, да ўсіх, хто падтрымлівае *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне",* ягоную *Кансэрватыўна-Хрысьціянскую Партыю — БНФ* і ўвесь *Беларускі Нацыянальна-Вызвольны Рух.* Зьвяртаюся з заклікам: ***не галасуйце за Лукашэнку і за яго заплечніка С. Гайдукевіча. Не галасуйце за У. Ганчарыка і С. Домаша. Не галасуйце за прамаскоўскіх кандыдатаў намэнклятуры.***

***І ў першым, і асабліва ў другім туры, выкрэсьлівайце ўсіх прамаскоўскіх кандыдатаў намэнклятуры, разам з Лукашэнкам! Выкрэсьлівайце ўсіх! Арыентуйцеся на паўторныя выбары з новымі, беларускімі кандыдатамі.***

Усе пазыцыі, якія выяўленыя ў гэтай маёй заяве, абмеркаваныя на *Паліткамітэце Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ*, разам з кіраўніцтвам *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне"* і прапанаваныя на Сойм *Народнага Фронту* і *Партыі БНФ.* Я не сумняваюся, што яны ўвойдуць як асноўныя палажэньні ў Праграму дзеяньняў усяго *Нацыянальна-Вызвольнага Руху* на пэрыяд палітычнай кампаніі па выбарах прэзыдэнта.

Мяркую, што, улічыўшы вопыт 1994 года, *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* менавіта цяпер, з пачаткам агітацыйнай кампаніі, павінны аб'явіць аб сваёй палітычнай апазыцыі да любога кандыдата намэнклятуры, у выпадку выбраньня яго на прэзыдэнта краіны.

Альтэрнатывай акупацыі, анэксіі, інтэграцыі, усім формам нэакаляніялізму і расейскага імпэрыялізму быў і зьяўляецца *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне"*, ягоная *Партыя* і ўвесь адраджэнскі беларускі рух. Змаганьне за Беларусь — гэта працэс, які не заканчваецца выбарамі прэзыдэнта. Беларуская альтэрнатыва ёсьць. І пакуль яна існуе, усіх беларусаў не ашукаюць.

Памятайма пра Беларусь! Тады не дапаможа Маскве ніякая здрада, ніякае намэнклятурнае прыстасаванства, ніякая дэмакратычная дэмагогія і ніякія хітрасьці нямецкай дыпляматыі. Жыла, жыве Беларусь, і будзе жыць!

*(15 жніўня 2001 г.)*

## *4. Выхад — паўторныя выбары*

Беларусь, якая практычна пазбаўленая нацыянальна арыентаванай палітычнай эліты, нагадвае мне сьляпога, якога зламысьнікі вядуць у бездань. Рай для нягоднікаў, замежных разьведак і сацыяльных паліттэхнолягаў.

Перш чым загарнуць уладу ў Расеі, КГБ адпрацаваў варыянт рэжыму ў Беларусі. Цяпер выпрабоўваюцца варыянты выбараў.

Пачынаючы з канца 1997 года, пасьля спалучэньня інтарэсаў рускага КГБ і нямецкай разьведкі ды дыпляматыі ў Беларусі, гэты спэцтандэм стаў ці ні наймацнейшай сілай, здольнай рабіць кардынальны ўплыў на працэсы ў краіне.

"Праект Чыгір" і падпольныя выбары прэзыдэнта ў 1999 годзе, „Хартыя-97", „перамоўны працэс" і „дыялёг", „аб'яднаная дэмапазыцыя" (без беларускіх ідэяў адраджэньня), моладзевая арганізацыя „Зубр" і, нарэшце, „пяцёрка" намэнклятуры ды „адзіны" намэнклятурны кандыдат — усё гэта не абышлося без інсьпірацыяў тандэму нямецка-расейскіх спэцслужбаў і агентуры.

Стратэгічная задача „тандэма" — разбурыць беларускі незалежніцкі рух супраць каляніяльнай палітыкі Расеі, зьнішчыць беларускае нацыянальнае Адраджэньне (перш за ўсё — *Беларускі Народны Фронт*) і ўключыць Беларусь у сфэру дзяржаўнага кіраваньня Масквы, узамен за саступкі немцам (у пэрспэктыве) у былой Усходняй Прусіі (Калінінградзкая вобласьць). Ні для немцаў, ні для расейцаў, ні для іхнага сумеснага капіталу, аб'яднанага ў канцэрн „Газпрам-Рургаз, не патрэбная „транзытная тэрыторыя" Беларусь і выплаты за транзыт.

Менавіта дзякуючы спэцыяльным стараньням з Усходу і з Захаду, быў аслаблены *Беларускі Народны Фронт*, рэанімаваная групоўка былой кебічаўскай намэнклятуры і, пад шырмай „дэмакратаў", уведзеная ў палітычны расклад прэзыдэнцкіх выбараў (так званыя „пяцёркі", „сямёркі", „адзіны кандыдат" і г.д.). Ажыцьцёўлены прынцып „кіруемага канфлікту", распрацаваны рускімі спэцслужбамі.

Я ўжо пісаў у папярэднім лісьце *(ад 15.08.2001г.)* пра магчымыя чатыры варыянты вынікаў выбараў. Найбольш небясьпечныя для Беларусі першы і другі варыянты (калі прэзыдэнтам стаў бы Лукашэнка-Гайдукевіч ці Ганчарык-Домаш і калі б іх прызнала міжнародная супольнасьць).

Нямецка-маскоўскі „тандэм" вядзе сваю палітыку, і, на першы погляд, здаецца, што Масква быццам бы не пярэчыць замене Лукашэнкі. Але гэта толькі здаецца, бо кожны трымае ў запасе сваю выгаду.

Відавочна таксама, што група Лукашэнкі адчула небясьпеку і верагоднасьць здачы Лукашэнкі з боку Масквы, і таму праводзіць сваю „гульню" — жорсткую, цьвёрдую, пасьлядоўную, не зважаючы на законы і права, тыпова дыктатарскую.

Пасьля нечакана лёгкага пазбаўленьня ад маёй кандыдатуры, быў перагледжаны ўвесь сцэнар выбараў. Акрамя С. Гайдукевіча, адкінулі ўсіх „запасьнікоў", дублёраў і паралельных стаўленікаў Масквы (нават Л. Сініцына і М. Марыніча), а С. Домаша, спэцыяльна падрыхтаванага для разьбіцьця нацыянальна-вызвольнага электарату, тут жа адвялі ўбок. (Потым яго, як службовую фігуру, хутчэй за ўсё ўвогуле выдаляць з „гульні".)

Зьнешне складваецца ўражаньне, што група Лукашэнкі, не зважаючы ні на якія правы і законы, дэманстратыўна, напралом хоча выйграць у першым туры. Лукашэнка паказвае, што яму непатрэбнае прызнаньне Захаду, што ён будзе дружыць з Пуціным, Хусэйнам ды Кадафі. У яго — свая кампанія. У выніку — пачынае здавацца, што ўсё набліжаецца да трэцяга варыянту (Лукашэнка „выйграе", але Захад выбары не прызнае).

Па маіх назіраньнях, аднак, і па раскладцы кандыдатаў усё падрыхтавана якраз да першага варыянту (Лукашэнка „выйграе" і яго прызнае Эўропа). Для гэтага патрэбны другі тур.

Калі на гэта пойдуць, то можа здарыцца наступнае. Груба і нахабна скарыстаўшы адміністрацыйны рэсурс і фальсіфікацыі, у другі тур выходзіць пара Лукашэнка-Гайдукевіч.

Што ў гэтай сітуацыі будуць рабіць Ганс Вік, кебічаўскія „адзіныя" кандыдаты і ўся „дэмакратычная" камарыльля, застаўшыся за бартом? Лямантаваць? Чаго? Выбары ж прадаўжаюцца „дэмакратычна" і на „альтэрнатыўнай" аснове. Ці можа Ганс Вік захоча даказаць, што Ганчарык набраў больш галасоў за Гайдукевіча і што галасаваньне сфальсіфікавалі? („Ай-я-яй, нядобра крыўдзіць кандыдата Гайдукевіча," — скажуць спадару Віку.) Зрэшты, Ганс Вік гэтага рабіць ня стане. І вядома, чаму.

Калі здарыцца другі тур, то як будуць паводзіць сябе вікаўскія назіральнікі за выбарамі? Што ім тады там назіраць і што рабіць? Стаць сьведкамі „справядлівага" выбраньня Лукашэнкі? Ці, можа, яны захочуць засьведчыць фальсіфікацыі і даказаць, што пакрыўдзілі дублёра Гайдукевіча? „Ды кіньце вы, — скажа дублёр Гайдукевіч, — я прэтэнзіяў ня маю, барацьба была чэсная."

Захаду нічога не застанецца, як прытрымлівацца ўсіх сваіх папярэдніх упартых заяваў аб прызнаньні Лукашэнкі ў выпадку „добрых" выбараў і — прызнаць Лукашэнку.

Тэхнічна гэта будзе азначаць, што КГБ Расеі (які на справе — за Лукашэнку), дзейнічаючы ў маскоўска-нямецкім тандэме, абкруціў вакол пальца хаўрусьніка Віка (што лічыў сябе найхітрэйшым).

Для Беларусі — гэта будзе чарговая народная катастрофа, пасьля чаго беларусам застанецца толькі праклясьці і здрадлівую Эўропу, і хітрую Маскву.

Можна не сумнявацца, што ў гэтай сітуацыі лібэральна-сацыялістычная Эўропа нас прадасьць, як прадала Чачэнію, як некалі ня раз прадавала Польшчу, Чэхаславаччыну ды Аўстрыю.

Але ёсьць выхад са становішча. Ён залежыць ад беларусаў і прапанаваны ўжо *Беларускім Народным Фронтам „Адраджэньне"* і арганізацыямі *Беларускага Нацыянальна-Вызвольнага Руху*. ***Трэба галасаваць супраць усіх кандыдатаў.*** Вынікам дружнага галасаваньня супраць усіх (гэта значыць супраць абодвух у другім туры) павінны стаць ***паўторныя выбары прэзыдэнта з новымі, беларускімі кандыдатамі***. (Адзначым, што 27 лістапада заканчваецца тэрмін Лукашэнкі па ягонай канстытуцыі. Узьнікаюць новыя ўмовы выбараў.)

Гэта адзіны выратавальны варыянт для Беларусі і магчымасьць пазьбегнуць маскоўскай пасткі. Дарэчы, тады (пры галасаваньні супраць усіх кандыдатаў) зьявіцца і сэнс у працы назіральнікаў за выбарамі. Неабходна збавіцца ад ачмурэньня кебічаўскімі зданямі і дэмакратычнай дэмагогіяй намэнклятурных рэваншыстаў.

Беларусь можна адвесьці ад палітычнае катастрофы. Беларусам трэба скарыстаць такую магчымасьць.

*Зянон ПАЗЬНЯК*
*Старшыня Беларускага Народнага*
*Фронту „Адраджэньне"*

*25 жніўня 2001 г.*

# АНТЫЗАКОННЫЯ ДЗЕЯНЬНІ РЭЖЫМУ ЛУКАШЭНКІ ПАДЧАС ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ПЕРАДВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ Ў БЕЛАРУСІ

*(Прэс-рэліз)*

...З самага пачатку перадвыбарчага працэсу, з першага яго этапу — збору подпісаў грамадзянаў за прэтэндэнтаў у кандыдаты на пасаду прэзыдэнта, — рэжым Лукашэнкі цынічна парушае законы, стварае ўмовы, у якіх ёсьць немагчымымі свабоднае волевыяўленьне беларускага грамадзтва і дэмакратычны характар правядзеньня выбараў.

Рэжым стварае ў краіне атмасфэру страху і няпэўнасьці. Афіцыйная прапаганда, выкарыстоўваючы непадзельны кантроль над сродкамі масавай інфармацыі, разгарнула брудную кампанію хлусьні і дэзынфармацыі грамадзтва. Галоўны ўдар сьціраваны на сп. Зянона Пазьняка — кандыдата ад *Беларускага Вызвольнага Руху*. Карыстаючыся ягонай адсутнасьцю і тым, што сп. З. Пазьняк ня можа зьвярнуцца ў суд, афіцыйная прапаганда выкарыстоўвае подлыя мэтады гёбельсаўскага стылю. Беларускае тэлебачаньне рэгулярна дэманструе псэўдадакумэнтальныя фільмы, дзе голас сп. Пазьняка накладзены на выявы нямецка-фашысцкіх акупантаў. Па тэлебачаньні, радыё і ў газэтах прапагандысты рэжыму сьцьвярджаюць, што сп. Пазьняк „раскошна жыве на амэрыканскія грошы за мяжой і прадае Беларусь Амэрыцы". У дадатак беларускае тэлебачаньне рэгулярна перадае „інфармацыйныя ўстаноўкі", палохаючы грамадзянаў і заклікаючы не адчыняць дзьверы кватэраў ды не размаўляць з незнаёмымі. Такім чынам рэжым імкнецца ізаляваць людзей і не дапусьціць іхнага уключэньня ў грамадзка-палітычны працэс.

Імя грамадзяніна Рэспублікі Беларусь Зянона Пазьняка ўнесена ў сьпісы памежнага кантролю з мэтай „ягонага затрыманьня пры спробе ўезду ў Беларусь". На запыты камандуючаму памежнымі войскамі Беларусі, на якой падставе аддадзены такі загад, кіраўніцтва *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* атрымала два адказы, якія абсалютна супярэчаць адзін аднаму. Да таго ж пракуратура Беларусі ўзбудзіла яшчэ ў чэрвені 1997 г. супраць сп. З. Пазьняка крымінальную справу па арт.71 Крымінальнага Кодэксу, фармулюючы беспадстаўныя, антызаконныя абвінавачваньні на падставе ягоных артыкулаў у газэтах *„Пагоня"* і *„Свабода"*. Такія дзеяньні ўладаў робяць праблематычным вяртаньне сп. З. Пазьняка на радзіму.

Намесьнік старшыні *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ сп. Сяргей Папкоў,* які зьяўляецца кіраўніком ініцыятыўнай групы *сп. З. Пазьняка*, таксама падвяргаецца рэпрэсіям рэжыму. Сп. Папкоў ужо падчас кампаніі збору подпісаў быў асуджаны да штрафу ў 57 тысячаў рублёў за выданьне інфармацыйнага бюлетэню *„Беларуская Салідарнасьць"*. Асуджаны незаконна, таму што пратакол быў складзены ў парушэньне заканадаўства.

Цэнтральная Выбарчая Камісія дапусьціла падмену палажэньня з арт. 61 Выбарчага Кодэксу Беларусі, карыстаючыся дазволам „тлумачэньня Закону". У Законе напісана, што завярэньне подпісаў сяброў ініцыятыўнай групы праводзяць „...главы или заместители главы

районной администрации в городе, **на территории которых проводился сбор подписей...**" А ЦВК замяніла гэтую пазыцыю на палажэньне: „руководителя или заместителя руководителя и удостоверяется печатью того местного исполнительного и распорядительного органа, **на территории которого проживают избиратели, поставившие свои подписи в этом подписном листе**". Такое „тлумачэньне" зьяўляецца парушэньнем закону і мае на мэце ўсталяваньне парадку рэгістрацыі подпісаў, пры якім дзясяткі тысячаў грамадзянаў ня мелі магчымасьці падпісацца ў падтрымку прэтэндэнтаў.

Абапіраючыся на незаконную інструкцыю Цэнтральнай камісіі, кіраўнікі раённых выканаўчых камітэтаў не завяраюць подпісы і адсылаюць сяброў ініцыятыўнай групы па вёсках у сельскія саветы. Як правіла, у гэты пэрыяд старшыні сельвыканкамаў адсутнічаюць на працоўных месцах. Так, у выніку трохдзённых паездак па вёсках Менскага раёну, удалося заверыць на сёньняшні дзень толькі 10% подпісаў жыхароў населеных пунктаў Менскага раёну. Звычайныя, нададзеныя законам натарыяльныя функцыі былі пераўтвораныя ў спосаб дыскрымінацыі грамадзянаў.

Кіраўніцтва раённых выканкамаў арганізоўвае ўціск на сябраў ініцыятыўнай групы, а таксама на грамадзянаў, якія падпісаліся за З. Пазьняка, праз кіраўніцтва прадпрыемстваў і ўстановаў ідуць пагрозы звальненьня з працы. (Як прыклад, — даведка сп. М. Шпакава з г. Клімавічы Магілёўскай вобласьці).

Да таго ж Цэнтральная Выбарчая Камісія надрукавала бланкі падпісных лістоў і пасьведчаньні зборшчыкаў подпісаў на расейскай мове, груба парушаючы беларускае заканадаўства і нацыянальныя правы беларусаў. Парадак запаўненьня, збору і рэгістрацыі подпісаў быў апублікаваны ЦВК толькі 25 чэрвеня 2001 г. (хаця кампанія збору подпісаў афіцыйна распачалася ўжо 21 чэрвеня). Такім чынам ЦВК арганізавала перашкоду працэсу збору подпісаў.

Цэнтральная і ўчастковыя камісіі былі ўтвораныя пры непасрэдным удзеле і пад камандай Лукашэнкі і яго атачэньня і, безумоўна, знаходзяцца пад ягоным поўным кантролем. Факт недапушчэньня ў склад выбарчых камісіяў прадстаўнікоў палітычных партыяў, як у нашай краіне, ня мае прэцэдэнту ў сучаснай практыцы краінаў дэмакратычнага сьвету.

26 чэрвеня 2001 г. Лукашэнка выдаў чарговы „прэзыдэнцкі дэкрэт" пад дэмагагічнай назвай „Аб абавязковым дэкляраваньні прыбыткаў і маёмасьці кандыдата ў Прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь, ягоных сваякоў, жонкі (мужа) і яе (яго) бацькоў і некаторых іншых захадах, накіраваных на правядзеньне адкрытых, свабодных і сумленных выбараў". Парушэньнем усіх юрыдычных нормаў зьяўляецца сам факт прыняцьця такога дакуманту, калі выбарчая кампанія ў краіне ўжо пачалася. Па сутнасьці сваёй гэты „дэкрэт" Лукашэнкі ня мае юрыдычнай сілы і не прадугледжаны беларускім заканадаўствам. Да кандыдатаў (і што самае галоўнае, да іхных сем'яў) прад'яўляецца бессэнсоўны па сваёй складанасьці комплекс патрабаваньняў. У дэмакратычных краінах дэкляраваньне прыбыткаў і маёмасьці патрабуецца толькі ад самога палітыка і кандыдата. Галоўнай мэтай „дэкрэту" ёсьць спроба пазбавіцца ад палітычных канкурэнтаў псэўдалегальным спосабам.

Антызаконныя дзеяньні рэжыму не дазваляюць прызнаваць выбары 9 верасьня 2001 г. у Беларусі дэмакратычнымі і адкрытымі.

*27 ліпеня 2001г* ***(Кіраўніцтва Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

# НАПАДЗЕНЬНІ

*(Выбраныя факты)*

*20 чэрвеня ў Віцебску* міліцыянт у цывільным, здалёк паказаўшы сваё пасьведчаньне ***Уладзімеру Плешчанку***, загадаў яму тэрмінова сыйсьці ад „сіняга дому", дзе спадар *Плешчанка* стаяў з інфармацыйным плякатам. На плякаце былі пазначаны тыя месцы, дзе пасьля 21 чэрвеня можна будзе паставіць свой подпіс за вылучэньне ***Зянона Пазьняка*** ў кандыдаты на прэзыдэнцкую пасаду.

*Сп. Плешчанка* адмовіўся выканаць гэткае патрабаваньне, але праз колькі хвілінаў на яго накінуліся трое мужчынаў у цывільным прафэсійнага выгляду і зьбілі. Заяву ў міліцыю, лічыць *сп. Плешчанка,* падаваць бязвынікова.

*Ул. Плешчанку* зьбівалі ў цэнтры Віцебску, на вачах у сотняў людзей.

* * *

*22 чэрвеня ў Лідзе* некалькі чалавек у цывільным напалі вечарам на ***Віктара Аўгустына*** — зборшчыка подпісаў з ініцыятыўнай групы падтрымкі Зянона Пазьняка. Бандыты жорстка зьбілі сп. *Аўгустына*, зламалі рэбры, нанесьлі цяжкія цялесныя пашкоджаньні і ўцяклі.

Гэтак пачынаецца выбарчая кампанія ў рэжыме Лукашэнкі.

* * *

*22 чэрвеня на Цэнтральнай плошчы ў Менску* ***Уладзімер Юхо*** зьбіраў подпісы за вылучэньне кандыдатам у прэзыдэнты Зянона Пазьняка. Група міліцыянераў-амапаўцаў запатрабавала, каб *Ул. Юхо* перастаў зьбіраць подпісы і зышоў з плошчы. Пагражалі выклікаць „крумкач".

*Ул. Юхо* прад'явіў пасьведчаньне сябра ініцыятыўнай групы, выдадзенае ЦВК і патлумачыў, што законам не абмежаваныя месцы збору подпісаў. Тады амапаўцы ўжылі сілу і пад прымусам выдалілі *Ул. Юхо* з плошчы.

* * *

*4 ліпеня ў Менску* зьдзейснены бандыцкі напад на сяброў ініцыятыўнай групы ў падтрымку Зянона Пазьняка ***Веру Палоньнікаву*** і ***Тамару Жукаву***, якія зьбіралі подпісы ў доме №4 па вуліцы Кунцаўшчына. На іх напаў з кулакамі мужчына, які выскачыў з кватэры №211, і нанёс жанчынам цялесныя пашкоджаньні. У *сп. Палоньнікавай* сур'ёзная траўма нагі. Пацярпелыя зьвярнуліся ў міліцыю.

* * *

*4 ліпеня ў Гомелі,* у час збору подпісаў у падтрымку кандыдатуры Зянона Пазьняка, у студэнцкім інтэрнаце №3 Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсітэту транспарта адбыўся напад на зборшчыцу подпісаў ***Тацьцяну Раманенка***. На яе з лаянкай і кулакамі накінулася вахцёрка **Н. Волкава**, якая пры гэтым крычала, што ёсьць загад рэктара не дазваляць зьбіраць подпісы ў інтэрнаце.

Уражаная хамствам і рукапрыкладствам спадарыня *Раманенка* напісала скаргу ў пракуратуру, наведала міліцыю і зафіксавала пабоі.

* * *

*4 ліпеня. У Гомелі* перашкоды ініцыятыўнай групе ў падтрымку Зянона Пазьняка чыняцца з боку ўладаў на кожным кроку. Ва ўсе ўстановы аддадзены абсурдныя загады. Калі сябра ініцыятыўнай групы ***Уладзімер Шыцікаў*** зайшоў у студэнцкі інтэрнат Гомельскага палітэхнічнага ўнівэрсітэту, каб сабраць подпісы, яго адмовіліся прапускаць, а камендант нават кінуўся адбіраць ад яго пасьведчаньне ЦВК аб зборы подпісаў.

* * *

*5 ліпеня ў Гомелі* нарад міліцыі спрабаваў выдаліць з Прывакзальнай плошчы сяброў ініцыятыўнай групы Зянона Пазьняка, якія зьбіралі там подпісы ў падтрымку ягонай кандыдатуры. Міліцыя запатрабавала ад ***Уладзімера Старчанкі*** і ***Рэгіны Пяскоўскай*** перастаць зьбіраць подпісы і пакінуць плошчу.

Зборшчыкі растлумачылі міліцыі закон і, не зважаючы на пагрозы, прадоўжылі сваю справу. Нарад адступіў.

*9 ліпеня ў Гомелі* адбыўся чарговы напад на зборшчыкаў подпісаў у падтрымку кандыдатуры Зянона Пазьняка. У доме №4 па вуліцы

Перамогі на сябраў *БНФ* ***Тацьцяну Раманенка*** і ***Алесю Кацапаву*** напалі трое п’яных савецкіх ветэранаў (двох жанчын і 70-гадовы мужчына). Яны зьневажалі зборшчыц, казалі, што іх трэба расстраляць, зачынілі ў пад’езьдзе і патрабавалі іхняе сьмерці, клічучы падмогу. На падмогу ў справе „сьмерці” ніхто не прышоў, але прыехала міліцыя (нехта выклікаў), вызваліла зборшчыц і прапанавала ім паехаць у пастарунак, скласьці пратакол ды даць справе ход. Спадарыні *Алеся* і *Тацьцяна* рашылі аднак, што трэба зьбіраць подпісы, а не хадзіць па судах і махнулі рукой на хуліганства.

А дарэмна. Калі ёсьць магчымасьць, трэба „вучыць” маскоўскую кліентуру (яна яшчэ, відаць, мала напілася беларускай крыві).

* * *

*10 ліпеня ў Менску* адбыўся напад на ***Аляксандра Неруша***, які зьбіраў подпісы у падтрымку кандыдатуры Зянона Пазьняка. Каля 16-й гадзіны на яго напалі трое людзей у цывільным на скрыжаваньні вуліц Сухараўскай і Шаранговіча. Яны спрабавалі паламаць столік, за якім сядзеў зборшчык подпісаў, і зьнішчыць бланкі з подпісамі. Калі на дапамогу *сп. Нерушу* кінуліся людзі, нападнікі зьбеглі. Выкліканы нарад міліцыі прыехаў надта позна.

* * *

Зафіксаваныя дзясяткі нападаў на людзей і чыненьні перашкодаў ініцыятыўнай групе па збору подпісаў за кандыдатуру Зянона Пазьняка. Адзначаны таксама парушэньні закону і супрацьдзеяньне іншым ініцыятыўным групам (акрамя групаў **А**. **Лукашэнкі** і **С**. **Гайдукевіча**).

***(Прэс-служба Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ)***

# УЛАДЗІМЕР ПЛЕШЧАНКА — ДА ВІЦЯБЛЯНАЎ

Зьвяртаюся ў першую чаргу да тых, хто займае актыўную грамадзянскую пазіцыю, хто стаіць за незалежнасьць Беларусі.

Сёньня, напярэдадні верасьнёўскіх выбараў Прэзыдэнта, для нас, беларусаў, склаліся вельмі няпростыя абставіны. На першы погляд можа здавацца, што знойдзеныя рычагі ўзьдзеяньня на Лукашэнку і нават вызначаны кандыдат, які стане яго галоўным апанэнтам. На палітычным полі засталося трое палітыкаў. Але іхная галоўная мэта — не барацьба за незалежнасьць Беларускай дзяржавы, не адраджэньне Беларускай нацыі, а набыцьцё ці захаваньне ўлады.

Казаць пра Лукашэнку ня буду. Сем гадоў усё паказалі.

Гайдукевіч у Беларусі грае ролю, як Жырыноўскі ў Расеі. Нават свае паводзіны перад выбаршчыкамі й мэтады дасягненьня палітычных мэтаў ён пераймае ў таго.

Ганчарык — прадстаўнік былой беларускай партыйнай намэнклятуры, якая ніколі не была нацыянальнай і інтарэсы беларускай нацыі не адстойвала. Ён быў не апошнім чалавекам у партыйнай іерархіі ў час чарнобыльскай трагедыі, у часы жнівеньскага путчу 1991 г., у час прыходу да ўлады Лукашэнкі, у часы ганебных рэфэрэндумаў 1995, 1996 гг. Мне асабіста добра вядомая яго дзейнасьць як кіраўніка арганізацыі па абароне правоў працоўнага чалавека, калі кіруемыя ім прафсаюзы двойчы давалі згоду на незаконнае мае звальненьне з працы ў сувязі са скарачэньнем штатаў, а на самой справе — з-за маёй палітычнай дзейнасьці. І двойчы, нават падуладныя Лукашэнку суды, мяне аднаўлялі на працы.

Былая савецкая, а тым больш партыйная, намэнклятура будзе адстойваць нацыянальныя інтарэсы толькі пад ціскам палітычных сілаў, што стаяць на нацыянальнай аснове. І ня так ужо й важна, ёсьць ці не ў гэтых сілаў магчымасьць прыйсьці да ўлады. Галоўнае, наколькі гэты ціск будзе моцным. Ён робіць намэнклятуру больш згаворлівай.

Такой сілай на час маючых адбыцца выбараў мог і павінен быў быць ***Зянон Пазьняк***. Адзін ягоны ўдзел у выбарах у якасьці кандыдата ў прэзыдэнты ўжо рабіў немагчымым пакорліва плыць Беларусі ў рэчышчы расейскай палітыкі.

Але гэтага не адбылося. (І не без дапамогі тых, хто палічыў удзел Пазьняка ў выбарах перашкодай пазбавіцца ад Лукашэнкі).

Лукашэнка ціснe на былую намэнклятуру, не дае ёй магчымасьці так, як у Расеі, свабоднага доступу да маёмасьці. Нават стаў садзіць у турмы. Але ж намэнклятура ў такім выпадку няхай навучыцца бараніць сама сябе. А яна вырашыла дзеля сваёй абароны ды набыцьця ўлады выкарыстаць нацыянальна-патрыятычныя сілы.

Каб выключыць магчымасьць удзелу Пазьняка ў палітычным працэсе, практычна, супраць яго быў выстаўлены Сымон Домаш (намэнклятура). Зборшчыкам подпісаў за Домаша нават грошы плацілі. Калі ж аказалася, што ня можа ўдзельнічаць у выбарах Пазьняк, — то не спатрэбіўся й Домаш!

Што тыя сотня тысячаў даляраў і для Ўсходу, і для Захаду. Незалежная краіна Беларусь будзе для іх каштаваць значна болей. Адным паменшыцца прыбытак ад продажу нафты й газу, другім наадварот, — павялічыцца іх кошт, бо ў Беларусі будзе свой інтарэс.

Танней паклапаціцца аб абароне правоў адной асобы ці, скажам, нейкай групы, чым аб праве цэлага народу.

Амаль кожны народ у пэўныя часы меў добрых і дрэнных кіраўнікоў. Але ж дзеля пазбаўленьня ад дрэннага нельга гандляваць краінай.

Сёньня ў нас практычна няма выбару, акрамя як не прызнаць гэтыя выбары. ***Сьвядомаму беларусу 9 верасьня галасаваць няма за каго!***

Выбары павінны быць праведзеныя без удзелу Лукашэнкі, бяз страху, калі ты гаворыш па-беларуску і зьбіраеш за свайго кандыдата подпісы, быць абазваным фашыстоўцам ці амэрыканскім шпіёнам, альбо атрымліваць пагрозы аб хуткай расправе.

Магчымасьці не прызнаць гэтыя выбары ёсьць. Нават калі Лукашэнка абвесьціць сябе пераможцам.

Ня наша справа ўдзельнічаць у расейска-беларускай намэнклятурнай падкоўдравай валтузьні. Мы павінны адстойваць свой беларускі інтэрас.

Наша задача была і раней, і сёньня, і заўтра ў час выбараў вылучаць і адстойваць нацыянальна сьвядомага, аддадзенага Беларусі прадстаўніка, а не шукаць паратунку ў намэнклятуры, ды яшчэ пад эгідай Расеі.

Для нас сёньня найбольш прыймальны лёзунг: *„**Галасуем супраць усіх кандыдатаў прарасейскай каляніяльнай намэнклятуры! Мусяць быць паўторныя выбары з новымі кандыдатамі**”.*

***“Мы — за справядлівыя беларускія выбары!”***

***Уладзімер ПЛЕШЧАНКА***

*Ліпень-жнівень 2001 г.*

# ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ: „БІЛІ Й КАТАВАЛІ”

*18 жніўня Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* і *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* разгледзеў пытаньне аб рэпрэсіях і грубых парушэньнях правоў беларусаў і заканадаўства ў час так званай „выбарчай” кампаніі па выбарах прэзыдэнта Беларусі. Сойм прыняў Пастанову і некалькі заяваў. У заяве пра рэпрэсіі адзначана, што „15 жніўня сёлета ўвечары ў Салігорску быў затрыманы міліцыяй сп. ***Алег Борын***, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.* Міліцыянты абшукалі яго і знайшлі агітацыйныя матэр’ялы. *Сп. Борына* завезьлі ў пастарунак, пратрымалі там усю ноч. Калі ён запатрабаваў выклікаць адваката і праваабаронцу ды патэлефанаваць дадому, міліцыянты завялі яго ў асобны пакой, выключылі сьвятло і зьбівалі, зьдзекліва кажучы пры гэтым: „Будет тебе и адвокат, и правозащитник”. У выніку катаваньняў *сп. Борын* атрымаў сур’ёзныя цялесныя пашкоджаньні.

Ягоная жонка, якая шукала яго ўсю ноч, даведалася аб ягоным затрыманьні толькі раніцай наступнага дня.

Зьверствы міліцыі ў дачыненьні да грамадзяніна, які падчас передвыбарчай кампаніі выкарыстоўвае свае права на агітацыю, сьведчаць пра сапраўдны характар антынароднага, антыдэмакратычнага рэжыму Лукашэнкі.

Мы патрабуем узбуджэньня крымінальнай справы ў адносінах да міліцыянтаў, якія катавалі *сп. Борына.*

*17 жніўня ў цэнтры Віцебску сп.* ***Уладзімер Плешчанка****,* ***Раман Салаўян****,* ***Барыс Хамайда*** *— сябры Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі—БНФ* — наладзілі пікеты з мэтай перадвыбарчай агітацыі (што не забараняецца дзейным заканадаўствам на пэрыяд перадвыбарчай кампаніі). Пікетоўцы разгарнулі плякаты з заклікам браць удзел у галасаваньні 9 верасьня і галасаваць супраць усіх кандыдатаў, каб наладзіць паўторныя выбары. Міліцыя затрымала пікетоўцаў і завезла іх у пастарунак, дзе быў складзены пратакол „за правядзеньне несанкцыянаванага пікету".

Падзеі паказваюць, што Лукашэнка даў загад на сілавое задушэньне сваіх рэальных апанэнтаў, актывістаў *Нацыянальна-Вызвольнага Руху.*

У такіх умовах нельга прызнаваць выбары ў Беларусі свабоднымі і справядлівымі."

# ГЕРАІЧНЫ ЎЧЫНАК АНДРЭЯ КАПОРЫКАВА

Напачатку інфармацыя. 20 ліпеня ў дзень адкрыцьця лукашэнкаўскага прапагандова-эстраднага фэстывалю „славянскі базар" у Віцебску ў канцы канцэрту (калі артысты выйшлі на сцэну на паклон) да сцэны з букетам ружаў падышоў малады хлапец. Ён кінуў ружы гледачам, узьняў *Беларускі Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* і голасна выкрыкнуў: „Жыве Беларусь! Хай Бог нам дапаможа!" Пры гэтым юнак раскідаў бел-чырвона-белыя ўлёткі.

На канцэрце ў амфітэатры прысутнічаў Лукашэнка са сваёй камарыльляй і некалькі тысячаў падабраных гледачоў зь вертыкалі, афіцыйных установаў, „лукамола" і г.д.

На юнака адразу накінуліся два тыпы з прэзыдэнцкай аховы і пачалі біць. Потым падскочылі яшчэ пяцёх, і ўсемярох яны пачалі мясіць юнака кулакамі, нагамі ды палкамі. Увесь час, пакуль яго зьбівалі, юнак крычаў: „Жыве Беларусь!" і „Дапаможа нам Бог!". Аж пакуль ня страціў прытомнасьць.

Тады лукашэнкаўскія грамілы вывалаклі непрытомнага хлопца з амфітэатру, цягнучы за ногі па зямлі. Ачнуўся ён на асфальце за амфітэатрам у акружэньні ахоўнікаў і міліцыянтаў. Тыя, заўважыўшы, што ён ачнуўся, зноў пачалі яго зьбіваць. Потым паднялі, паклалі тварам на міліцэйскую машыну і яшчэ нейкі час мэтадычна зьбівалі, пакуль хлопец не перастаў варушыцца.

Затым юнака адвезьлі ў Кастрычніцкі РАУС, дзе зноў зьбівалі. Потым, калі хлопец ачнуўся, яму ўчынілі тры допыты ў прысутнасьці высокага міліцэйскага начальства, склалі два пратаколы „аб хуліганстве" і аб выкарыстаньні „недазволенай сымволікі". У чатыры гадзіны раніцы хлопца адпусьцілі да суду.

* * *

Завуць геравічнага юнака, які ахвяраваўся сабой дзеля Беларускага Сьцяга, ***Андрэй Капорыкаў***. Ён сябра *Маладога Фронту,* мае 21 год, выпускнік Віцебскай Мастацкай вучэльні.

Учынак Андрэя ўражвае. Гэта геройскі ўчынак. Побач зь Міронам і дзясяткамі іншых маладых беларусаў, Андрэй сапраўдны герой *Беларускага Бел-Чырвона-Белага Сьцяга.* Яго подзьвіг паказаў веліч лепшай беларускай моладзі і адначасна рэзка высьветліў нізасьць рэжыму нікчэмнасьцяў, здраднікаў і халуёў.

Карціна атачэньня, на фоне якой адбыўся гераічны ўчынак Андрэя, — шакуе. Перад сцэнай сем лукашэнкаўскіх гарылаў зьбіваюць юнака на вачах Лукашэнкі, шматлікай рэспэктабэльнай публікі і „мастацкай інтэлігенцыі" — артыстаў базарнага шоў. І ўсе глядзяць, і ўсе маўчаць. Некаторыя нават паўставалі зь месцаў, каб лепей бачыць.

Зразумела, што Лукашэнка не такога ўзроўню чалавек, якому б магло прыйсьці ў галаву (ужо не кажу пра сэрца) загадаць спыніць пабіцьцё. Тут усё зразумела. Але артысты, гледачы...

Вось вам і пэўны зрэз пэўнага грамадзтва. Вось вам і мадэль паводзінаў.

Зрэшты, у амфітэатры сабралася адна масьць і адна якасьць людзей. Таму мы не абагульняем. Высновы нашы маюць сьціслa канкрэтны адрас. Тыя, хто там былі, і не маглі па-іншаму ўспрыняць подзьвіг Андрэя Капорыкава.

* * *

10 жніўня судовы працэс над Андрэем Капорыкавым доўжыўся ўсяго адну гадзіну. Гэбісты і ўлада зразумелі, што лепш спусьціць гэты суд хуценька і непрыкметна, каб не прыцягваць увагі да гераізму маладога беларуса і каб ніхто не даведаўся, як паводзіў сябе рэжым. У гэтай справе якраз яны (гарылы і міліцыянты) павінны сядзець на лаве падсудных.

Таму суддзя **Эдуард Казлоў**, блытаючыся, пасьпешна прысудзіў Андрэю штраф у памеры аднаго мінімальнага заробку (7,5 тысячаў рублёў альбо 5 даляраў ЗША) і пастараўся скончыць судовую камэдыю. Ён не захацеў ні паклікаць сьведкаў, ні глядзець відэазапіс, бо разумеў, што падсудны і яго абаронца могуць зажадаць, каб прыцягнулі да адказнасьці „гарылаў" і ўсіх тых, хто беспадстаўна і па-зьверску зьбіваў юнака, прычыніў яму цяжкія цялесныя пашкоджаньні ды расстройства здароўя.

Андрэй ня стаў разьменьвацца на парахункі з „гарыламі". Якія тут законы, якое там правы.



*Беларускія сьцягі на фоне камуністычнай намэнклятуры. 1989 г., люты. Масавы мітынг БНФ на Менскім стадыёне "Дынама"; 40 тысячаў удзельнікаў. (Фота Ул. Кармілкіна)*

„Маёй мэтай, — сказаў ён на судзе, — было зрабіць гэты ўчынак дзеля таго, каб усе людзі ўбачылі, што жыве наш Беларускі Сьцяг, што ён ёсьць, быў і будзе на нашай Бацькаўшчыне.”

***Мар'ян ВАНЬКЕВІЧ,***
***Валеры БУЙВАЛ***

# ЖЫЦЬЦЁ БЕЛАРУСКАГА СЬЦЯГА

*(Травень-ліпень 2001. Фрагмэнты хронікі)*

***„Горад — наш".*** *11-13 траўня* сябры *Маладога Фронту* адзначылі 6-ю гадавіну незаконнага „чорнага рэфэрэндуму” (14 траўня 1995 г., у выніку якога была зьмененая дзяржаўная сымволіка). Дзясяткі беларускіх *Бел-Чырвона-Белых сьцягоў* былі вывешаныя ў самых людных месцах у 20-ці гарадах Беларусі. Акцыя называлася „Горад — наш”.

Большасьць *Бел-Чырвона-Белых сьцягоў* была вывешана *ў Менску*. На вышынных будынках праспэкта Скарыны, вуліцаў Багдановіча і Варвашэні, ва Ўручча, Вясьнянцы, Зялёным Лузе. Сьцягі луналі больш паўсутак.

У мікраraёнах Малінаўка, Серабранка, Усход беларускія сьцягі былі відаць яшчэ 14-га траўня.

Гэтакія ж акцыі адбыліся *ў Горадні, Магілёве, Берасьці, Пінску, Слуцку, Рэчыцы, Стоўбцах, Заслаўі, Салігорску, Сьветлагорску, Крычаве* ды іншых гарадах Беларусі.

*У Віцебску* (акрамя вывешваньня нацыянальных сьцягоў уначы) больш за 10 хлопцаў і дзяўчат сабраліся на плошчы Перамогі ды прымацавалі на даху грамадзкай прыбіральні чырвона-зялёны лукашысцкі сьцяг з партрэтам Лукашэнкі, які вісеў больш за гадзіну, пакуль яго не зьнялі міліцыянты.

„Вертыкальныя” ўлады пасыўна рэагавалі на дзейнасьць маладафронтаўцаў. Ва ўсіх гарадах, дзе прайшла акцыя „Горад — наш” не было ніводнага затрыманага.

* * *

***Брыгадзір Каханчык.*** *30 верасьня 1999 г.* брыгадзір чыгуначнай станцыі Баравуха пад Полацкам *Анатоль Каханчык* намаляваў на адным з пристанцыйных будынкаў вялізны *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.* Намаляваў па ўсіх правілах манумэнтальнага жывапісу, алейнаю фарбаю. Пасажыры цягнікоў, пабачыўшы сьцяг, кожны раз махалі рукамі з вагонных вокнаў.

У адрозьненьне ад пасажыраў, тутэйшае чыгуначнае „вертыкальнае” кіраўніцтва адразу выявіла незадавальненьне і стала патрабаваць ад брыгадзіра, каб той зафарбаваў палітычна небясьпечныя колеры.

Баравуху з тае пары наведалі шмат якія начальнікі, у тым ліку і са сталіцы. І ўсе яны патрабавалі прыняць з вачэй Беларускі сьцяг. Па сьведчаньні сп. Каханчыка, яму і ягоным сябрам даводзілася нават пільнаваць сярод ночы, каб хто не запэцкаў выявы нацыянальнай сьвятыні.

Усё цягнулася да пары, пакуль ў Віцебскім аддзяленьні беларускай чыгункі не зьмяніўся кіраўнік. Ім стаў нейкі **Паховкін**. Гэты, каб выслужыцца, пачаў ажно зямлю рыць. Сьцяг зафарбавалі. Праўда, ненадоўга. Кажуць, у Баравусе рыхтуецца нешта нязвыклае.

* * *

***Жодзіна.*** У Жодзіна з 27 па 28 чэрвеня *Малады Фронт*, разам з маладзёвай арганізацыяй *Ліцьвіны* вывесілі велізарны *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* на дроце паміж двума 12-павярховымі дамамі. Міліцыя на вачах шматлікіх цікаўных дзьве гадзіны намагалася зьняць Сьцяг пры дапамозе пажарнай машыны. Але нічога не атрымалася.

Тады ў справу ўлучыліся камунальнікі і дратамі зь вялікімі цяжкасьцямі за пяць хвілінаў да прыезду Лукашэнкі ў Жодзіна сарвалі *Беларускі Хрыстовы Сьцяг.*

І хто б калі падумаў, што людзі такое зноў будуць рабіць.

* * *

***Гомель.*** Восем паветраных шароў, напоўненых геліем, падымалі ўгару палотнішча нацыянальнага *Бел-Чырвона-Белага Сьцягу*. ***Людзьміла Патароча*** ў атачэньні сяброў *Маладога Фронту* нейкі час трымала ў руках тонкую жылку, прывязаную да шароў, і толькі на сярэдзіне пляцу, калі паказалася міліцэйская машына, Людзьміла, пад воплескі адпусьціла шары з нацыянальным сьцягам у неба.

Так маладыя гамельчукі адзначылі *Дзень Дэкларацыі пра незалежнасьць.*

* * *

***Малады Фронт.*** *Малады Фронт*, паводле сваёй традыцыі, правёў у Менску ў ноч з 26 на 27 ліпеня акцыю „Горад — наш!” Гэтым разам маладафронтаўцы вывесілі *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі* на будынках, дзе месьцяцца штабы прэтэндэнтаў на прэзыдэнта *(Зянона Пазьняка, Уладзімера Ганчарыка, Сямёна Домаша),* на вуліцы Варвашэні й на праспэктах Машэрава й Францішка Скарыны.

* * *

***Мірон.*** У цэнтры Берасьця 27 ліпеня на праспэкце Машэрава і на вуліцы Савецкай былі ўзьнятыя вялікія *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі*. Гэта зрабіў знакаміты *Мірон*, які вырашыў так павіншаваць берасьцейцаў з гадавінай прыняцьця Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі.

*(Эфір)*

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *КРАСАВІК (працяг)*

*9 красавіка.* ***Мікола Савіцкі***, прафэсар, сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ. Фашызм у тралейбусе.* „9 красавіка ў тралейбус, у якім я ехаў, энэргічна ўвайшлі дзьве жанчыны ў суправаджэньні міліцыянтаў і пачалі правяраць квіткі. Я зьвярнуўся да кантралёраў па-беларуску, спытаў, як ім працуецца пад аховай дубінак? У адказ пачуў — „бэнээфавец!” Другая абазвала мяне паліцаем і фашыстам. Усёй камандай пачалі спаборніцтва паміж сабой на больш моцнае зьневажэньне мяне як беларуса па моўнай прыкмеце. На маю адмову выйсьці з салёну міліцыянт схапіў мяне за куртку, на якой я нашу *Бел-Чырвона-Белы сьцяжок*, і нанёс мне некалькі прафэсійных удараў.

Што гэта? Я жыву на сьвеце 68 год, бачыў гвалт нямецкіх фашыстаў. Перажыў страшную блякаду 1943 года на Ўшаччыне (цяпер у Расеі тое ж самае называецца „зачістка”). І вось цяпер... Што робіцца на нашай зямлі?”

*9 красавіка, Віцебск.* Сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімера Плешчанку*** затрымалі на вуліцы супрацоўнікі Кастрычніцкага РАУС. У пастарунку на яго склалі пратакол за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу, які адбыўся 25 Сакавіка ў Віцебску на плошчы Волі. Спадар Плешчанка падпісваць пратакол адмовіўся.

У гэты ж дзень на віцебскім аўтарынку быў затрыманы сябра *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Пётра Сырапеня***. Ён раздаваў улёткі ***„Беларуская Салідарнасьць”*** сваім сябрам. Гэта было заўважана тамтэйшым ахоўнікам, і ягоны рапарт стаўся падставай для затрыманьня і складаньня пратаколу, дзе напісалі: „распаўсюджваў улёткі, якія накіраваныя на падрыў канстытуцыйнага ладу”.

*11 красавіка, Менск.* Супрацоўнікі службы бясьпекі Лукашэнкі затрымалі непаўнагадовых ***Дзяніса Налібока*** і ***Івана Тамашэвіча***. Іх даставілі ў пастарунак, склалі пратаколы за распаўсюджваньне незарэгістраванай друкаванай прадукцыі.

Хлопцы раздавалі гумарыстычнае „Пасланьне беларускаму народу прэзыдэнта нацыянальна-алімпійскага камітэту ўсіх славянаў”, у якім адзначалася, што за 7 гадоў прэзыдэнцтва мала што ўдалося зрабіць, бо „прэзыдэнту замінае мой уласны народ. Мой народ не апраўдаў майго даверу, і ў мяне няма даверу да гэтага народу”, — напісана ў „пасланьні”.

*11 красавіка* завершыўся разгляд адміністрацыйнай справы ў судзе Цэнтральнага раёну Гомеля. Прадстаўнікі міліцыі абвінавачвалі намесьніка старшыні *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ сп.* ***Уладзімера Старчанку*** і сябра Партыі *спн.* ***Алесю Кацапаву*** ў арганізацыі несанкцыянаванага пікету ў цэнтры Гомеля на Дзень Незалежнасьці. Абвінавачваемыя заявілі, што сьвяткавалі галоўнае нацыянальнае сьвята разам зь іншымі грамадзянамі Беларусі, і гэта ёсьць іхнае чалавечае і грамадзянскае права. Суддзя **Яраслаў Парэмскі** вынес жорсткі прысуд — штраф у памеры 200 тысячаў рублёў кожнаму з абвінавачаных. Нагадаем, што за ўдзел у сьвяткаваньні Дня Незалежнасьці *сп.****Юры Беленькі***, выконваючы абавязкі старшыні Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ у Беларусі, быў асуджаны на 15 сутак арышту.

*13 красавіка, Пінск.* Студэнта 4-га курсу Пінскага філіялу Інстытута Кіраваньня і прадпрымальніцтва ***Вадзіма Макеева*** выключылі з інстытута за беларускую дзейнасьць (Загад рэктара №124). Фармальнай прычынай названы пропуск заняткаў. Раней В.Макеева Рэктарат інстытута пагражаў выключыць за нашэньне беларускай вышыванай кашулі (*гл. „Веларускія Ведамасьці”, — 2000, №6/29*) Цяпер спраўдзілі пагрозу. Дырэктар Пінскай філіі інстытуту **Валеры Савінаў** пацьвердзіў, што вучыцца Вадзім добра і адлічэньне з вучобай не зьвязана.

*17 красавіка, Віцебск.* За распаўсюджаньне бюлетэня „***Беларуская Салідарнасьць”*** са зваротам *Зянона Пазьняка* затрымалі сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімера Плешчанку*** і ***Барыса Хамайду***.

*18 красавіка.* А 22-й гадзіне сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Валянцін Герасімовіч*** і ***Павел Сіняк*** вярталіся дадому ў цэнтры Менску. Іх спынілі два патрульныя міліцыянты: прапаршчык **Ігар Лабковіч** і малодшы сяржант **Юры Ушкар**. Адразу было зразумела, што абодва „вартавыя парадку” знаходзяцца ў стане алькагольнага ап’яненьня. Міліцыянты запатрабавалі прад’явіць дакументы. У сп.Сіняка дакументаў не было і яго адпусьцілі. А прад’яўлены сп.Герасімовічам дакумант забралі і павялі яго ў апорны пункт (бліскучая лёгіка!). Па дарозе ў цёмным месцы міліцыянты груба абшукалі затрыманага і забралі ўсе грошы, якія ён меў пры сабе. А калі знайшлі партыйныя выданьні і артыкулы *Зянона Пазьняка,* то закрычалі: „Ага, дык ты яшчэ й бэнээфавец!” Завялі ў апорны пункт, але дзяжурны міліцыянт адмовіўся складаць пратакол, заявіўшы, што няма складу правапарушэньня. Сп.Герасімовіча пратрымалі ў пастарунку 2 гадзіны і адпусьцілі, але скрадзеныя грошы не вярнулі.

Гэты факт яскрава сьведчыць аб тым, што міліцыя паступова становіцца антыграмадзкай сілай, якая выкарыстоўвае крымінальныя мэтады. Якая можа быць барацьба са злачыннасьцю, калі ў цэнтры сталіцы п’яныя патрульныя міліцыянты рабуюць грамадзянаў?!

*21 красавіка, Віцебск.* Штраф ***150*** мінімальных заробкаў прысудзіла суддзя **Сьвятлана Туфан** сябру *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Уладзімеру Плешчанку***.

Амаль штодня ён распаўсюджваў партыйную літаратуру ў цэнтры Віцебску. Гэтая доўгатэрміновая акцыя раздражняе гарадзкія ўлады. Судовы прысуд Сьвятлана Туфан узгадняла зь Віцебскім гарвыканкамам. Пра гэта памочнік суддзі сказаў асабіста У.Плешчанку.

Судовае паседжаньне пераносілася 8 разоў. На ім разглядаліся адразу 9 пратаколаў пра затрыманьні сп. Плешчанкі на працягу апошняга месяца.

Абвясьціць прысуд падсуднаму С.Туфан не зьявілася (не хапіла духу) і прыслала сакратарку. Гэткая непавага глыбока абурыла спадара Плешчанку, які, па ягоных словах, і без таго шмат страціў часу на безвыніковыя паходы ў суд і сядзеньні ў кабінэтах. Таму, пазнаёміўшыся з рашэньнем суддзі, ён ізноў сьціраваўся ў цэнтар Віцебску распаўсюджваць фронтаўскую літаратуру.

*24 красавіка, Менск.* Група моладзі правяла ў Менску ў парку Горкага тэатралізаваную акцыю „Канчатковы дыягназ галоўнаму пацыенту”. Увечары там сабралася каля 2-х тысячаў чалавек. Галоўнымі дзеючымі асобамі пэрфомансу былі фігуры ў масках з тварам Лукашэнкі („галоўны пацыент”) і „псіхіятары” ў белых халатах. Міліцыянты і асобы ў цывільным затрымлівалі ўдзельнікаў акцыі. Падчас затрыманьняў вызначыўся афіцэр міліцыі **Уладзімер Новікаў**, які біў галавой аб сьцяну затрыманую ***Кацярыну Шабан***, ад чаго яна згубіла прытомнасьць. Лекары зафіксавалі ў яе страсненьне мазгоў. Яна накіравала на Новікава скаргу, і той павінен адказваць за сваё злачынства.

Глыбока ўначы непаўнагадовых і некаторых дарослых з затрыманых адпусьцілі. А пад раніцу 16-ць затрыманых даставілі ў спэцпрыёмнік-разьмеркавальнік на вул. Акрэсьціна, дзе яны адседзелі па 3-4 сутак. Асуджаныя судамі ўдзельнікі акцыі: ***Сяргей П’яных** — 10 сутак адміністрацыйнага арышту;* ***Ірына Тоўсьцік***, ***Дар’я Раткевіч***, ***Намік Ахадаў***, ***Уладзімер Драздоў***, ***Андрэй Канстанцінаў***, ***Яраслаў Сьцешык***, ***Раман Карповіч***, ***Аляксандар Боган** — усе да 3 сутак арышту;* ***Дзяніс Арцяшкевіч***, ***Антон Сяляўка** — штраф у памеры 20 мін. заробкаў;* ***Пятро Садоўскі***, ***Вольга Бурая***, ***Наста Чэрнік***, ***Тацьцяна Кучко***, ***Алесь Апраніч***, ***Кірыла Фідэльман***, ***Віталь Струй***, ***Кацярына Шабан***, ***Зьміцер Іваненка***, ***Сьвятлана Данілава***, ***Ірына Паўлючэнка***, ***Андрэй Крыўко***, ***Тацьцяна Марозава** — папярэджаньні.*

*25 красавіка ў Менску* быў зьдзейснены напад на сябра Сойму *Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне”* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ спадара* ***Генадзя Банкевіча***. А $23^{30}$ ля ягонага дому на яго напалі трое невядомых, нанесьлі некалькі ўдараў па галаве так, што ён упаў. Скралі сумку, дзе былі асабістыя і партыйныя дакументы, а таксама пэнсія (сп.Банкевічу 70 гадоў).

За апошні час гэта ўжо ня першы напад на сяброў Партыі. Крыміналізацыя грамадзтва і бездапаможнасьць уладаў, прыярытэтам якіх зьяўляецца барацьба зь мірнымі пратэстамі беларускіх патрыётаў, становіцца галоўнай прыкметай часу.

*25 красавіка, Менск.* Патруль Дзяржаўтаінспэкцыі затрымаў уначы сяброў *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* мужа і жонку ***Рабянковых*** у часе расклейваньня абвестак з заклікам прыняць удзел у жалобным шэсьці „*Чарнобыльскі Шлях”*. Складзены пратакол, рыхтуецца позва ў суд (нягледзячы на тое, што ў іхных дзеяньнях поўнасьцю адсутнічае якое-небудзь парушэньне закону).

*25 красавіка, Менск.* Па вуліцы Маякоўскага 2 гадзіны быў паралізаваны рух транспарту. Работніцы Камвольнага камбінату перагарадзілі вуліцу ў час стыхійнай акцыі пратэсту, патрабуючы выплаты заробкаў. Утварыўся кілямэтровы аўтамабільны затор. Абвесьцілі: спыняць акцыю толькі пасьля выплаты заробкаў. Жанчыны не спалохаліся ні міліцыі, ні супрацоўнікаў спэцслужбаў, якія пачалі „здымкі”.

Пасьля другой гадзіны пратэсту Генэральны дырэктар прадпрыемства **Вікенці Шкатула і** кіраўнік Дзяржканцэрну Беллехпрам **Ул. Астрожскі** паведамілі, што паслалі па грошы. Частку запазычанасьці паабяцалі выплаціць сёньня, астатняе — заўтра. Толькі пасьля гэтага людзі згадзіліся разыйсьціся.

*26 красавіка, Віцебск.* Сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Раман Салаўян*** і ***Юры Карпаў*** правялі пікет пад лёзунгам:***”Прэч, акупацыйны Чарнобыль!”***. Іх затрымала міліцыя. У той жа дзень суддзя Кастрычніцкага раёну **Афанасьева** вынесла ім прысуд: па 10 сутак адміністрацыйнага арышту. У судовай пастанове было таксама запісана: „Рэчавы доказ (*Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*) — зьнішчыць”.

*26 красавіка, Ляхавічы.* Сябра *Сойму Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* ***Ігар Лобан*** занёс артыкул ***Ул.Старчанкі „Ідзе Вялікая***

***Чарнобыльская вайна”*** ў Ляхавіцкі райвыканкам, аддаў яго старшыні райсавету для азнаямленьня. Старшыня **Аркадзь Салун** перадаў артыкул начальніку міліцыі, дапісаўшы, што лекар Лобан распаўсюджвае ўлёткі, якія парушаюць спакой у грамадзтве.

*27 красавіка, Менск.* Стыхійны страйк адбыўся на заводзе Аўтаматычных ліній з прычыны нявыплаты заработнай платы.

*27 красавіка, Пінск.* Міліцыя склала пратакол на арганізатараў жалобнага шэсьця *Чарнобыльскі Шлях* у Пінску ***Лявона Вабішчэвіча*** і ***Ігара Саракавіка***. Рыхтуецца судовая справа.

*28 красавіка, Пінск.* Адбыўся суд над ***Лявонам Вабішчэвічам*** і ***Ігарам Саракавіком*** за *Чарнобыльскі Шлях.* Арганізатары шэсьця, якое адбываецца ў Пінску ўжо 8-ы год, атрымалі папярэджаньне за арганізацыю несанкцыянаванай масавай акцыі.

■ *Красавік. БЕРАЖЫЦЕ ДЗЯЦЕЙ АД ХЛУСЬНІ. Зварот Сакратарыяту ТБМ да журналістаў, настаўнікаў і бацькоў з нагоды правядзеньня прымусовых палітінфармацыяў у навучальных установах Беларусі.*

Паважаныя сябры і калегі! Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны выказвае сваю заклапочанасьць з нагоды ўвядзеньня прымусовых палітінфармацыяў ва ўсіх навучальных установах Беларусі. Цяперашнія ўлады непакоіць рост нацыянальнай сьвядомасьці сярод школьніцтва і студэнцтва. Пад пагрозай апынуліся іхныя пляны поўнай русіфікацыі і дэнацыяналізацыі маладога пакаленьня нашай краіны. Увагу нашых дзяцей хочуць прыцягнуць да патокаў хлусьні, што ліюцца ў эфіры беларускага тэлебачаньня, прымусіць пераказваць адзін аднаму ўсе тыя трызьненьні, што гучаць у інфармацыйных і „аналітычных” праграмах БТ. Але часы, калі формула „чым больш відавочная хлусьня, тым лягчэй у яе паверыць”, ужо мінулі. Зьвяртаемся да вас, паважаныя журналісты, часьцей зьмяшчайце матэр’ялы, прысьвечаныя Беларусі, культуры, беларускай мове, праўдзіва асьвятляйце пытаньні дыскрымінацыі беларусаў.

■ *Пра выміраньне нацыі сьведчыць школьная статыстыка. Усяго ў Беларусі* **1.498.417** *школьнікаў. Зь іх вучыцца па-беларуску* **29%,** *70,9% — па-расейску. Паводле перапісу 1999 г., у краіне* **81,6%** *беларусаў.* **85,6%** *з гэтай колькасьці лічаць беларускую мову роднай.*

■ Сьмяротнасьць ад прычын, зьвязаных з ужываньнем алькаголю, за часы Лукашэнкі павялічылася ў 2,4 разы.

У 1997 годзе распалася 67,5% шлюбаў ад колькасьці зарэгістраваных. У параўнаньні з 1995 годам колькасьць дзяцей-сіротаў узроасла больш чым на 30%.

За апошнія 9 гадоў працягласьць жыцьця сярэднестатыстычнага грамадзяніна Беларусі скарацілася на 3,2 года.

Толькі 10-15% выпускнікоў школаў могуць лічыцца здаровымі. 45-47% маюць паталягічныя адхіленьні, а 40% пакутуюць на хранічныя захворваньні.

У 1994 годзе ў зьняволеньні знаходзілася 37,4 тысячаў людзей, у 1999 годзе- 47,5 тысячаў.

Калі ў 1994 годзе на ахову здароўя і адукацыю выдзялялася 7% валавога прадукту, то ў 2000 годзе- 4,5% і 6,4% адпаведна.

У зоне з радыяцыяй ад 15 да 40 *Cи* у Беларусі па-ранейшаму жывуць 140 тыс. чалавек. Туды штогод накіроўваюць маладых спецыялістаў.

***( Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і Прэс-служба БНФ.*** *Па матэрыялах Камісіі, СМІ (друку, радыё), „Вясны-96”, SANA)*

# АДЗІНАЦЦАТАЯ ГАДАВІНА ДЭКЛЯРАЦЫІ

Сёлета — адзінаццатая гадавіна прыняцьця Дэклярацыі аб Дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. У этапах аднаўленьня беларускай дзяржаўнасьці дзень ***27 ліпеня 1990 года***, паводле храналёгіі, ідзе адразу за ***25-м Сакавіка 1918 года***.

Пасьля крывавага здушэньня *Слуцкага паўстаньня* і акупацыі *БНР*, краіна знаходзілася пад поўным кантролем Масквы.

Вярхоўны Савет 12-га скліканьня, дзе нацыянальна-незалежніцкія дэпутаты складалі зусім нязначную частку, быў вымушаны прымаць Дэклярацыю як пад уплывам зьнешніх фактараў (суверэнітэт абвесьціла Расейская Фэдэрацыя), гэтак і ўнутраных (незалежнасьць была галоўным патрабаваньнем шматлюдных мітынгаў *Народнага Фронту*).

Фактычна, усе артыкулы Дэклярацыі распрацоўвалі *дэпутаты ад БНФ*. Ім жа давялося і абгрунтоўваць іх ад мікрафону. Сакратары райкамаў, старшыні калгасаў, генэралы і дырэктары, мо ўпершыню, пачулі, што беларуская дзяржаўнасьць мае карані ў тысячу гадоў.

У нейкі момант камуністычная парляманцкая большасьць адчула, што ў галасаваньні за прапанаваныя народафронтаўцамі фармулёўкі зайшла занадта далёка, і тады дэпутаты *Апазыцыі БНФ* нечакана пакінулі залю. Манэўр спрацаваў: астатнія ці не аднагалосна прагаласавалі за Дэклярацыю, праўда, адмовіўшыся лічыць яе вышэйшай за тагачасную Канстытуцыю БССР, якая ўсё яшчэ трымала Беларусь ў складзе Савецкага Саюза.

Статус канстытуцыйнай сілы Дэклярацыя аб дзяржаўным суверэнітэце атрымала праз год, пасьля правалу „гэкачэпісцкага путчу” ***25 жніўня 1991 года***. Праз тры тыдні *гэрб Пагоня* і *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* былі зацьверджаныя ў якасьці дзяржаўных сымвалаў, а ў сьнежні Вярхоўны Савет ратыфікаваў Віскулёўскія пагадненьні, канстатуючы канчатковы распад СССР і ўсталяваньне цяпер ўжо безумоўнай Незалежнасьці Беларусі.

***Сяргей НАВУМЧЫК***

# НЯХАЙ ЖЫВЕ БНР!

*7-га ліпеня* адбыўся ў Менску зьезд беларусаў сьвету міжнароднае арганізацыі *„Бацькаўшчына”*. Беларускі скульптар з Парыжу ***Міхась Навумовіч*** выступіў з кароткай прамовай, дзе сказаў наступнае:

*“Моцна жадаю, каб гэтае спатканьне ўсіх беларусаў сьвету на пачатку новага тысячагоддзя прынесла для ўсіх ня толькі шмат прыемных успамінаў, але таксама вялікую надзею, што ўсе нашыя стараньні і высілкі, у якія мы заахвоціліся, давядуць нас да мэты — поўнай незалежнасьці і панаваньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Гэтую мэту ўжо нам паказалі нашыя продкі, якія сцьвердзілі Акт 25 Сакавіка 1918 года...*

*Так, мы мусім прадаўжаць змаганьне, у нас іншае альтэрнатывы няма. Мусім прадаўжаць яго з найвялікшай настойлівасьцю і з любоўю да нашага Краю і Народу”.*

Шмат было добрых і яркіх выступаў, якія сьведчылі, што Беларусь, як найвышэйшая, сьвятая каштоўнасьць, жыве ў нашых сэрцах.

***Т. РЭЙТАН***

# БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

## *Жмудзінскі калгас*

*(Успамінае Валеры Сядоў)*

1989 год. У Беларусі камуністычны рэжым, „сакалоўшчына” ці, як казалі тады, — „Вандэя”. А саўдэпія ўсёроўна трышчыць па швах. Шырыцца народны рух, людзі прагна ўчытваюцца ў нашую газэту *„Навіны БНФ „Адраджэньне”.* А ня ведаюць, што друкаваць яе мы езьдзім ажно пад эстонскую мяжу, у латышскі горад Валміера. Едучы па тэрыторыі балтыйскіх акупаваных дзяржаваў, мы бачым штораз узмацненьне гарбачоўскай блякады Летувы, якая першай з усіх паняволеных абвясьціла незалежнасьць у сакавіку таго года.

Бронемашыны і патрулі на дарогах, нахабныя плякаты інтэрфронту: „Товарищи! Сплотимся вокруг обкомов и горкомов! Позади Москва!” І зацяты, упарты супраціў летувісаў.




*Ушануйма ахвяры...*

Мы вярталіся на машыне, напакаванай накладам апошняга нумару, стомленыя і задаволеныя. І раптам заўважылі за сабой хвост, гэбуха імчала за намі на белай „волзе”. Што рабіць? Дарога пустая, раніца... Убачыўшы першы прасёлак, я гукнуў кіроўцу: „Паварочвай!” „Волга” паляцела за намі. Мы даехалі да летувіскай вёскі; задбаныя дамы, акуратныя ходнікі... Уехалі на калгасны двор, мэханізатары аглядаюць тэхніку перад сяўбой. Я кінуўся да іх. Торкаючы пальцам у „волгу”, што спынілася непадалёк, сказаў ім, што мы беларускія нацыяналісты, вязём сваю газэту ў Менск, а гэтыя... Бачу, у дзядзькоў сьціснуліся кулакі і нешта па-свойму кажуць рэзка між сабой. Першай паехала бэтонамяшалка, заблякавала дарогу. Потым, хто на трактары, хто на грузавіку, паехалі разам з намі. Суправаджала нас да дарогі цэлая „кавалькада”. Не пасьпеўшы разьвітацца з мэханізатарамі, мы рванулі на Менск.

Па вуліцах сталіцы БССР ішоў люд, шмат інтэлігенцыі, якой як жа далёка было да тых жмудзінскіх калгасьнікаў!

## *„А душа тамака засталася...”*

*(Успамінае Хведар Майсеенка)*

Канец вайны, травеньскія дні. Нашу частку разгарнулі недзе пад Бэрлінам, нейкі Штральзунд, ці як там. І вось начальства сабралася падпісваць капітуляцыю. Паставілі асобным шыхтом рускіх, далей — амэрыканцы і ангельцы. Шмат войскаў. Праходзяць немцы, з савецкіх шыхтоў чуецца: „Дабіць, дабіць!”. А тыя ідуць, апусьціўшы галовы. Праўда, іх не чапалі і шкоды не зрабілі.

Хто і як падпісваў капітуляцыю, вы мяне не пытайце. Я служыў на кухні, малады жаўнер, што я мог бачыць? Нам была іншая радасьць. Сустрэліся мы з хаўрусьнікамі. Балявалі зь імі цэлы тыдзень. Сярод амэрыканцаў цьма нэграў. Чорныя, мне ажно дзіва, ніколі іх ня бачыў. Надта нас шанавалі, усьміхаліся, абдымалі і цалавалі. Спачатку было неяк брыдка, а потым прывыклі. Усе вясёлыя і дужа прыязныя: радасьць усеагульная — канец вайне! Штодня запрашалі нас да сябе.

Як жа ў іх усё было арганізавана! У машынах столікі, крэслы. Сталы накрывалі — вочы разьбягаліся. Упершыню ў жыцьці я ўбачыў шакалад, пасмакаваў... Пілі яны ня так, як у нас прынята: хлоп — і ўсё ў рот. Кожны адпівае па глытку і перадае наступнаму. І не гарэлку, а віно. Смачнае, у галаву ня біла. Рознымі прысмакамі частавалі.

Я пасябраваў з адным ангельцам. Малады жаўнер, як я, проста не адставаў ад мяне. Нават разумеліся зь ім. На пальцах паказвалі, а зь іншых нехта словы дадаваў. Ён усё паўтараў: „Паедам у Англію, там у мяне сястра маладая. Будзеш жыць...” А я адказваў: „Не, не магу. Дома ж засталіся маці і два брацікі...”

А потым паціху сталі зьнікаць нашы жаўнеры, паўцякалі на захад. Праз тыдзень нас разьвялі, і больш мы новых сяброў ня ўбачылі.

А тут атрымалі загад і паехалі ў Галяндыю. Там сустрэлі шмат нашых дзяўчат, што немцы загналі былі на працу. Яны былі вельмі радыя, плакалі і хутчэй хацелі вярнуцца дадому. Ехалі назад у Нямеччыну ў маленечкіх такіх вагонах. Потым разьмяшчалі іх у лягеры ў акуратных бараках, выдавалі пайкі. І праз пэўны час адпраўлялі ў Расею. Ня ведаю, што зь імі было потым.

Вярнуўся я на сваю Брагіншчыну і адпрацаваў 50 гадоў на ферме. Працавалі мы з жонкай, ня ведаючы адпачынку. Яна, бедная, да канца працавала, ткала больш за маладзейшых. А хто не хацеў працаваць, ішоў у камуністы. Як стаў камуністам, глядзь — ужо кінуў вілкі, ходзіць і камандуе.

А потым настаў Чарнобыль. Перасялілі нас у Менск. А душа тамака засталася, у роднай вёсцы.

***(Запісаў В. Буйвал)***

# КУРАПАТЫ ІМКНУЦЦА ЗЬНІШЧЫЦЬ

*Курапаты* пэрыядычна зьнішчалі ўвесь час, як толькі скончылася 2-я Сусьветная вайна. Але толькі пасьля 1988 года (часу публічнага адкрыцьця злачынства) зьнішчэньне набыло пастаянны крымінальны характар і працягваецца па сёньняшні дзень. Галоўная прычына гэтага — антыбеларускі акупацыйна-каляніяльны характар улады на Беларусі. Кіруюць ідэйныя нашчадкі тых, хто акупаваў нашу краіну і расстрэльваў людзей у *Курапатах*.

Рэжымы Кебіча і Лукашэнкі спрабавалі сфальсіфікаваць доказы і факты пра *Курапаты*. Але, пасьля 4-й спробы „рэвізіі”, яны зразумелі, што гэта ня толькі немагчыма, але і небясьпечна для „рэвізораў” гісторыі, бо гісторыя нягоднікам помсьціць.

Вырашылі падыйсьці зь іншага боку — узмацніць крымінальшчыну і распачаць будаўніцтва ў зоне пахаваньняў. Нядаўна рэанімавалі праект пашырэньня дарогі і забудовы ў раёне *Курапатаў;* да магілаў пачалі звозіць сьмецьце, інспіраваць вандалізм і г.д.

22 ліпеня была разьбітая гранітная лавачка-помнік — падарунак прэзыдэнта ЗША ад народу Амэрыкі ў памяць пакутаў, якія перажылі беларусы. Над помнікам зьдзекваліся.

15 жніўня, у дзень вялікага хрысьціянскага сьвята *Ўнебаўзяцьця Дзевы Марыі,* рэстаўраваны помнік быў зноў па-сьвятакрадзку зьнішчаны. Разбураны таксама некаторыя іншыя памятныя знакі.

Зразумела, што існуючыя ўлады будуць толькі спрыяць крымінальным інспірацыям і ня стануць прытрымлівацца законаў, каб ацаліць *Курапаты* ад псаваньня і зьнішчэньня. Апошняя інстанцыя і адзіная сіла, якая ў такіх варунках можа абараніць памяць пра мартыралёг нацыі, — гэта грамадзкасьць, сумленныя людзі, грамадзкія арганізацыі.

Свой голас у абарону сьвятога месца ўзвысіў *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”* і *Партыя БНФ*, якія заклікалі падняцца ўсіх за народны гонар і беларускі боль.

24 ліпеня кіраўніцтва *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* абнародавала заяву пра акт вандалізму ў *Курапатах*. *„Сьвятое для ўсіх беларусаў месца пакутніцтва нявінных ахвяраў камуністычна-расейскай тыраніі — урочышча Курапаты — ушанавалі помнікамі іншыя народы, — пішуць у заяве культурныя людзі. — Каб жыла памяць і не паўтараліся злачынствы. У студзені 1994 году Прэзыдэнт Злучаных Штатаў Амэрыкі Біл Клінтан асабіста адкрыў у Курапатах невялікі манумэнт, на якім па-ангельску і па-беларуску напісана: „Ад народа Злучаных Штатаў Амэрыкі беларускаму народу дзеля памяці”. Дар амэрыканскага народу стаўся адным з сымвалаў хрысьціянскага адзінства, высокім выразам спачуваньня трагедыі.*

*У ноч на 22 ліпеня сёлета ў Курапатах быў зьдзейснены чарговы акт вандалізму. Вандалы разбурылі манумэнт, падораны амэрыканскім народам. Гранітная пліта, паколатая і патаптаная нагамі, сарваная і адкінутая на некалькі мэтраў убок. Па надпісу, высечанаму на пліце, чырвонай фарбай напісана па-расейску „Анархия”. Помнік патрабуе грунтоўнай рэстаўрацыі.*

*Неаднаразовыя звароты нашай партыі да ўладаў з патрабаваньнямі прыняць меры і спыніць акты вандалізму ў Курапатах, пакараць вінаватых не далі ніякага выніку. Дагэтуль сьвятому месцу ўладамі не нададзены статус мэмарыялу, які ахоўваецца дзяржавай. Улада, якая па сутнасьці ёсьць каляніяльным прамаскоўскім рэжымам, з моманту адкрыцьця праўды пра трагедыю ў Курапатах робіць усё, каб сказіць гістарычную праўду, перакласьці адказнасьць за злачынствы з расейскага бальшавізму на іншых злачынцаў, схаваць ад грамадзтва ісьціну. Рэжым стварае „камісіі” з псэўдаспэцыялістаў і ілжэсьведкаў, спрабуе ўвесьці ў зман беларускую і сусьветную супольнасьць, каб справакаваць агрэсію супраць людзей, якія адкрылі праўду, ды ачарніць памяць ахвяраў. Улады, фактычна, падбухторваюць да вандалізму ў Курапатах. Апошні акт вандалізму выклікае асаблівую трывогу ў сувязі з распачатай у апошні час „рэканструкцыяй кальцавой дарогі г.Менска”, якая праходзіць праз урочышча Курапаты. Улады маюць разбуральны плян, паводле якога пашыраная дарога павінна прайсьці па касьцях ахвяраў. Фактычна, пад прыкрыцьцём рэканструкцыі плянуецца зьнішчэньне месца, якое служыць напамінам пра трагедыю народу.*

*Мы зьвяртаемся да народу і кіраўніцтва Злучаных Штатаў Амэрыкі ды іншых дэмакратычных краінаў з заклікам прыйсьці на дапамогу беларускаму народу і не дапусьціць чарговага злачынства на нашай зямлі, якое плянуюць зьдзейсьніць каляніяльны рэжым і ягоныя маскоўскія гаспадары.” (24 ліпеня 2001 г.)*

Рэанімацыя неактуальнага праекту аб пашырэньні кальцавой дарогі праз *Курапаты* і дарогі Заслаўе-Калодзішчы невыпадкова ўсплыла цяпер. Справа не ў дарогах. Справа *ў Курапатах*. Усё робіцца па-савецку. Цяпер адбываецца этап дэмагогіі і ашуканства кшталту „Курапаты обойдут стороной” і дарога будзе пракладзена „с учетом максимального сохранения существующих захоронений” і г.д.

Гэта савецка-расейскі слэнг каляніяльнай бюракратыі, варвараў і разбуральнікаў. Ён ужываецца з адной мэтай: атрымаўшы санкцыі на пабудову, ашукаць і засаніць грамадзтва.

Трэба ўлічыць, што дарогай справа ня скончыцца. Чакаецца будаўніцтва жылога масіва паміж дарогамі, дзе разьмешчаныя *Курапаты*, з падводкай усіх інжэнерных камунікацыяў, пабудовай кацельнай, уязных дарог, дарожных мастоў і г.д.

Даўно б зрабілі, ды грошай няма. У 90-х гг. кебічаўская намэнклятура, абабраўшы народ, будавала сабе бесталковыя „царскія вёскі”. Была вельмі занятая сабой, сваім матэрыяльным клопатам — хапнуць паболей. А якраз тады і ўзьнік гэты праект.

Вось вытрымкі з аднаго дакумента сямігадовай даўніны.

*„Протокол рабочего совещания по вопросу планировочной организации территории, примыкающей к Минской кольцевой автодороге в районе урочища Курапаты 21 декабря 1993 г. г.Минск, ГПИ „Минскпроект”*

*Присутствовали: от Комитета по архитектуре и строительству:*

*1.* **Владимиров Ю.И**. *— главный инженер*

*2.* **Козловский С.А**. *— зам. начальника отдела планировки и застройки;*

*от Советского райисполкома:*

*3.* **Калякин С.И.** *— председатель РИКа*

*4.* **Ласкателев Б.Е**. *— главный архитектор Советского района;*

*от ГПИ „Минскпроект”:* (пералічваецца яшчэ сем асобаў). *В обсуждении выступили: Пурецкий Ю.П., Козловский С.А., Калякин С.И.*

*Решили: 1. Одобрить предложения по планировочной организации территории”* і г.д.

Яшчэ пяць пунктаў і подпісы ўсіх прысутных.

Управа Сойму *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* зьвярнулася 6-га жніўня з адкрытым лістом да Кабінэту Міністраў Рэспублікі Беларусь.

*“Стала вядома,* — сказана ў лісьце, — *што заплянавана рэканструкцыя Менскай кальцавой дарогі і вядуцца праектныя работы па варыянту пашырэньня існуючай дарогі, пракладзенай праз урочышча Курапаты.*

*Усяму сьвету вядома, што ва ўрочышчы Курапаты расстраляныя і пахаваныя некалькі сотняў тысячаў нявінных людзей. Было б непапраўнай памылкай працягнуць практыку былога камуністычнага рэжыму абгрунтоўваць мэтазгоднасьць таго ці іншага праекту эканамічнымі выкладкамі, пры гэтым пераступаць праз жыцьці, душы і памяць людзей.*

*Савецка-камуністычны рэжым хаваў сае злачынствы, так было і з урочышчам Курапаты. Дарога праз Курапаты ёсьць злачынства, зьдзейсьненае савецкімі ўладамі. Сёньня пашыраць дарогу праз урочышча Курапаты — гэта значыць пашыраць злачынства.*

*У сувязі з тым, што ідзе рэканструкцыя кальцавой дарогі, неабходна выправіць мінулыя хібы яе будаўніцтва.* ***Новая дарога павінна прайсьці ў абыход урочышча Курапаты****.*

*Са свайго боку, мы зробім усё магчымае, каб данесьці да грамадзтва новае плянуемае злачынства супраць беларускага народу і супроцьстаяць ягонаму зьдзяйсьненьню.”*

Адказу на гэты ліст не зьявілася. Праектаваньне дарогі праз Курапаты прадаўжаецца.

Дзьвесьце год — адно і тое: вынішчэньне. Цяпер топчуцца па магілах, ідуць па нашых сьмерцях. Але толькі жывыя могуць паўстаць.

***Т.РЭЙТАН***

# ТРАДЫЦЫЯ

Людзі часта гавораць пра традыцыі, не задумваючыся, што азначае традыцыя і чаму яна існуе. Ім здаецца, што традыцыі, як дождж і вецер, ці як прывычка, існуюць самы па сабе. Бо цяжка ўявіць культурнае грамадзтва без традыцыяў культуры.

Сапраўды, працэс утварэньня традыцыяў ва ўсіх галінах дзейнасьці людзей разьвіваецца самаісна. Традыцыя ёсьць найважнейшы чыньнік захаваньня і жыцьцяздольнасьці культуры. Культура зь неразьвітымі традыцыямі — слабая культура. Яна можа рассыпацца, зьнікнуць пры ўскладненьні жыцьцёвых абставінаў. А гэта суправаджаецца пакутамі людзей і агульным зьбядненьнем чалавечага грамадзтва.

Калі гвалтоўна развальваюцца традыцыі ці дэградуюць ад

зьмяшаньня з чужародным, тады людзі ***перастаюць разумець адзін аднаго***, грамадзтва перажывае рэгрэс, культура спараджае хімеры. Развал адстояных уяўленьняў і дэградацыя соцыюма прыводзіць да прымітывізацыі і змаленьня асобы.

Захаваньне традыцыяў заўсёды было клопатам вышэйшых людзей у грамадзтве. Можна дакладна вызначыць: па тым як адносяцца людзі да захаваньня традыцыяў, мераецца іхны ўзровень культуры.

Традыцыя ёсьць вынік калектыўнай дзейнасьці людзей. Гэта плён агульнай творчасьці і супольных уяўленьняў. Традыцыя — асаблівая зьява, якая існуе толькі ў жывым грамадзтве і рэалізуецца тады, калі ствараецца тып, альбо канон, ёсьць варыянтнасьць і пастаяннае насельніцтва.

* * *

Вельмі наглядна традыцыі відаць у мастацкай творчасьці, бо творы мастацтва валодаюць выразнай аўтаноміяй і самастойнасьцю (адасобленасьцю) ад носьбітаў. У калектыўным (народным) мастацтве гэтая самастойнасьць толькі частковая. У індывідуальным (прафэсійным) — практычна цалкавітая.

Гносэалягічна мастацтва зьвязанае з рэлігійнымі ўяўленьнямі і вырастае з аднаго кораня. Мэта рэлігіі — пазнаньне Бога і дасягненьне вечнага існаваньня душы ў ідэальным стане. Мэта мастацтва — узвышэньне душы праз адлюстраваньне (стварэньне) эстэтычнага ідэалу.

У філясофскім пляне мастацтва і рэлігію можна разглядаць як адзіны працэс пазнаньня абсалютнай ісьціны. Рэлігія — шлях непасрэдны, ***шлях дасягненьня*** праз веру. Мастацтва — гэта шлях апасродкаваны, ***шлях набліжэньня*** праз вобраз ідэальнага хараства.

Трэба ведаць, што хараство ёсьць функцыя ісьціны. ***Ісьціна заўсёды вечная, простая і прыгожая.***

Таму апасродкаваныя шляхі набліжэньня да ісьціны (Бога) ішлі праз ***мудрасьць*** (філясофія, навука і т.п. „рацыё”) і праз ***мастацтва*** (вобразы хараства). Непасрэдны шлях, як я ўжо адзначаў, ляжыць пасярэдзіне — ***шлях веры***. (Гэта значыць успрыняцьце ісьціны агулам, усёй істотай, адразу такой, якой яна ёсьць.)

Ні адзін з трох шляхоў не гарантуе ад памылак, і толькі адзін шлях сапраўдны (шлях веры). Але сумяшчэньне гэтых накірункаў ёсьць агульнай дарогай духоўнага разьвіцьця чалавецтва. І гэта якраз пацьвярджае гісторыя.

У калектыўны пэрыяд мастацкай творчасьці людзей кожны народ па-свойму адлюстроўваў ідэал хараства, ствараў сваю сістэму вобразаў і мастацкіх традыцыяў. Тут дзівосны сінтэз. Бо, адлюстроўваючы аб'ектыўную эстэтычную ісьціну праз сваю вобразную сістэму і традыцыі творчасьці, народ выяўляў адначасна сябе, сваю душу, паняцьці і ўяўленьні.

У працэсе калектыўнай творчасьці ***вобразнае выяўленьне*** сістэматызавалася ў аптымальную форму, набывала закончаныя і дасканалыя абрысы. Так узьнікла ***традыцыя як найлепшае выяўленьне сутнасьці, якое характарызавалася аптымальнасьцю, закончанасьцю і дасканаласьцю***.

Такім чынам традыцыя станавілася ***ўнівэрсальным перадатачным мэханізмам захаваньня культуры, цягласьці яе з пакаленьня ў пакаленьне***. Гэта сапраўдны ўсенародны скарб, набытак, які стагодзьдзямі жывіў творчасьць і эстэтычнае разьвіцьцё людзей у адпаведным і найлепшым для іх рэжыме паняцьцяў і адчуваньняў.

* * *

Гвалтоўнае зьнішчэньне традыцыяў — гэта заўсёды культурная катастрофа. Тут трэба адрозьніваць натуральны працэс, выкліканы грунтоўнымі і вельмі хуткімі пераменамі ў грамадзтве, і працэс намераны, накіраваны спэцыяльна на зьнішчэньне традыцыяў культуры.

Беларусы, апынуўшыся ў расейскай імпэрыі, сутыкнуліся з выпрацаванай палітыкай разбурэньня традыцыяў беларускай культуры. У XIX стагодзьдзі найбольш пацярпела беларуская архітэктура і гарады. Над Беларусяй нібы пранёсься зьнішчальны ўраган. Але вынішчэньні XIX-га стагодзьдзя нельга параўнаць з тым, што зрабілі потым у XX-м стагодзьдзі рускія бальшавікі.

У даўняй Беларусі для абазначэньня традыцыйнага, выпрабаванага ўкладу жыцьця і культуры ўжываўся ўнівэрсальны тэрмін ***„старына”***. „І каб старыны ня рухалі...”— пісалі звычайна магілёўскія, смаленскія ці быхаўскія мяшчане, стаўляючы ўмовы.

Бальшавікі, ставячы задачу зьнішчэньня традыцыйнай культуры, прыдумалі свой „тэрмін”, свой назоў разбурэньню, які быў антытэзісам азначэньню „старына”. Гэта ярлык „старьё” (што азначае — старызна).

Тэрмін „старьё” быў асабліва небясьпечны на пабытовым, нізкім узроўні сьвядомасьці, у асяроддзі соцыюма, дзе якраз адбывалася ягонае прыжываньне. У савецкіх навуковых сфэрах маглі казаць што іншае, з прыцягненьнем навуковай тэрміналёгіі, але на практыцы татальная камуністычная палітыка вынішчэньня культуры абапіралася на безапэляцыйную формулу: „Зачэм это старьё!”. І далей чулася прымітыўная нігілістычная дэмагогія, што трэба будаваць „новае”, адмаўляцца ад „старога”, аджылага, глядзець „наперад”, а не „назад” і г.д.

Формула „зачэм старьё” пратрывала да апошняга дня існаваньня СССР.

Камуністычныя варвары вынішчылі ў Беларусі тысячы помнікаў архітэктуры і сакральнага дойлідзтва. Яшчэ ў 1961 годзе ўзрывалі культурныя здабыткі XII-га стагодзьдзя (царква Дабравешчаньня ў Віцебску), а ў канцы 1980-х гадоў разбурылі Менскае Замчышча XI-га стагодзьдзя і архэалягічны драўляны Менск, што існаваў у ім. (На месцы Замчышча пабудавалі станцыю мэтро „Няміга”.) Былі разбураныя старадаўнія могілкі і гістарычныя цэнтры беларускіх гарадоў ды мястэчак, зьнішчаныя тысячы прыдарожных крыжоў і капліц ды каменных муроў, вадзяных млыноў ды ветракоў, шмат дзе поўнасьцю ліквідавалі беларускія народныя строі адзеньня (забаранялі апранаць) і народныя рэлігійныя абрады, высьмейвалі аўтэнтычны фальклёр, настройвалі моладзь у школах супраць свайго.

Адначасна ўжывалі іншы татальны, больш выраблены мэтад вынішчэньня беларускіх традыцыяў культуры, накіраваны ў асноўным на зьнішчэньне фальклёру (песьняў, танцаў, звычаяў, абрадаў, сьвятаў і г.д.). У камуністычнай псэўдатэорыі ён называўся „развитие традиций” (разьвіцьцё традыцыяў) і рэалізаваўся на практыцы найбольш праз „мастацкую самадзейнасьць”.

Для камуністаў-ідэолягаў усё жыцьцё — гэта „борьба” (барацьба). Разьвіцьцё — гэта ў іх „барацьба новага са старым”. Таму камуністы заўсёды „змагаліся”, уступалі ў „вечны бой”, вялі „бітву за ўраджай” на „трудовом фронте”, скідвалі „працоўны дэсант”, ішлі „от победы к победе”, „заваёўвалі новыя рубяжы” і г.д. — усё з крыкам ды камандамі.

З традыцыі, згодна камуністычных „тэарэтыкаў”, трэба было браць „лепшае”, адкідаць „горшае”, „несучаснае”, і прылучаць „новае”, „сучаснае”. Крытэрыі вызначаліся „па паняцьцях”, задачы — па цыркулярах.

Была створаная сетка сельскіх клюбаў, раённых „дамоў культуры” і „дамоў народнай творчасьці”, дзе ў большасьці сядзела цэлая армія недавучак, „арганізатараў культуры” і „разьвівальшчыкаў традыцыяў”. Нашэсьце гэтай арміі за дзясяткі гадоў „барацьбы на культурным фронце” прынесла больш шкоды, чым карысьці. Што датычыць традыцыяў, то ня гледзячы на стараньні асобных энтузіястаў, вынішчана было амаль усё жывое.

* * *

Традыцыя ў калектыўным мастацтве — гэта закончаная і дасканалая зьява. Яе далейшае самаўдасканальваньне прыводзіць да канону, які зьяўляецца ***самадастатковым***. Kананізаваная традыцыя існуе стагодзьдзямі якраз з прычыны гэтых сваіх якасьцяў (дасканаласьці і самадасатковасьці) і таксама ***варыянтнасьці*** — зьявы характэрнай якраз

для калектыўнай творчасьці, бо кожны выканаўца ў фальклёрнай традыцыі, прытрымліваючыся канону, зьяўляецца ня толькі выканаўцам, але й творцам, што выяўляецца ***ў імправізацыі***. (Дарэчы, адметнай прыкмецё агульнай фальклёрнай традыцыі).

Адначаснае сумяшчэньне канону, варыянтнасьці і імправізацыі стварае дзівосную зьяву — ***непаўторнасьць*** аўтэнтычнага фальклёру. Гэтая фэнамэнальнасьць рэалізуецца ў працэсе жывога выкананьня (жывога — ня значыць, што на сцэне, а ў натуральных каляндарна-тэрытарыяльных абставінах).

Традыцыю калектыўнай творчасьці, з прычыны яе закончанай формы, нельга структурна зьмяняць, бо гэта прыводзіць да яе разбурэньня і зьнікненьня. Традыцыя, як кананізаваная форма калектыўнага мастацтва, не паляпшаецца нейкім з боку, гвалтоўным умяшаньнем у яе сутнасьць. Яе можна толькі прымаць такой, якой яна ёсьць, і прадаўжаць.

Традыцыю ў адной галіне творчасьці, ці аднаго ўзроўню мастацтва можна скарыстоўваць у іншай галіне, ці ў іншым узроўні мастацтва. Можна скарыстоўваць элемэнты традыцыі, ці яе форму, ці нават яе рэмінісцэнцыі, але ўсё мусіць называцца сваім назовам (бо гэта ўжо не традыцыйная творчасьць). Не павінна быць ***падмены*** аднаго мастацтва іншым, адной галіны творчасьці — іншай.

Менавіта падмена зьяўляецца сутнасьцю і вынікам разбуральнага камуністычнага паняцьця „разьвіцьцё традыцыяў”. Якраз устаноўка на падмену выклікала ўмяшаньне ў традыцыйны парадак і разбурэньне аўтэнтычнай народнай творчасьці.

Паколькі ўстаноўка была ідэалягічнай (зьмяніць, палепшыць ды абсучасьніць) і зыходзіла з дзяржаўна-партыйных установаў — усё астатняе давяршвала звычайная чалавечая цемната, бескультур’е і неадукаванасьць „мэтадыстаў” ды функцыянэраў такой палітыкі.

Трэба сказаць, што сярэдні ўзровень адукацыі і эстэтычных паняцьцяў савецкага чалавека адпавядаў узроўню фармулёўкі „разьвіцьцё традыцыяў”. Калі савецкі чалавек чуе, што нельга збоку ўмешвацца і зьмяняць традыцыю, тады ён (скажам, доктар якіх-небудзь тэхнічных навук, што мяркуе на ўсе тэмы) зьдзіўляецца: „А як жа тады разьвіцьцё? Што, жыцьцё павінна спыніцца?”

Зрэшты, можна прывесьці па аналёгіі прыклады і з тэхнікі, і з фізікі, і ўвогуле — з прыроды. Нікому, скажам, не прыходзіць у галаву ўдасканаліць форму кола, зрабіць яго больш выцягнутым, ці сплюшчаным, ці хваліста-ўвогнутым і т.п. У людзей хапае здаровага сэнсу не задумваючыся разумець, што кола — гэта дасканала завершаная сістэма. Палепшыць яе немагчыма, зьмяніць нельга (бо гэта будзе ўжо ня кола). Можна толькі ім карыстацца, выкарыстоўваць і вар’іраваць (што і робіцца ў тэхніцы). І ніхто не задае пытаньне: хто прыдумаў кола. Прыдумалі людзі (і дарэчы, не адразу).

Традыцыя ў калектыўным мастацтве — гэта таксама „кола” — дасканалая, як мы ўжо адзначылі, завершаная форма (сістэма) выяўленьня адпаведнай сутнасьці. Нельга яе перайначыць.

Тут адлюстраваньне вельмі агульных заканамернасьцяў. Наша фізічная трохмерная прастора ёсьць частка бясконцага сьвету. Наш трохмерны сьвет мае закончаную колькасьць дасканалых, сістэмна завершаных геамэтрычных формаў (геамэтрычных фігур), закончаную колькасьць асноўных колераў, асноўных гукаў; існуюць парогі адчуваньня сьвятла і парамэтры пераменаў стану рэчыва і г.д. Усё зьменлівае багацьце і шматаблічнасьць нашага фізічнага сьвету ёсьць варыянтнасьць і мадыфікацыя пэўных завершаных асноваў. ***Разбурэньне асновы прыводзіць да разбурэньня зьявы.***

Тым часам сістэмная завершанасьць (самадастатковасьць, самадасканаласьць) фізічных асноваў прадвызначае ўнівэрсальную заканамернасьць разьвіцьця і стварэньня ***ўсяго***. Менавіта: адпаведнасьць (адэкватнасьць) паміж формай і зьместам зьявы. Умоўнасьць формы і ўмоўнасьць зьместу маюць цэнтрабежную тэндэнцыю да завершанага адзінства. У ідэале ўмоўнасьць формы і ўмоўнасьць зьместу імкнуцца стаць адной існасьцю і дасягнуць дасканаласьці. Гэтае імкненьне (назавём яго *шляхам гармоніі*) падпарадкоўваецца законам існасьці: прыгажосьці, прастаты і вечнасьці. (Вечнасьць дасканалай сістэмы ў дадзеным выпадку ёсьць яе завершанасьць у адпаведным сьвеце).

У пачатку 60-х гадоў, калі сьвет быў яшчэ пад уражаньнем адкрыцьця малекулы ДНК, мяне зацікавілі апісаньні трох амэрыканскіх вучоных-адкрывальнікаў (Ф. Крыка, М. Уілкінса, Д. Уотсона) пра тое, як рабілася адкрыцьцё.

Вучоныя перамянілі вялікае мноства структурных мадэляў малекулы пры расшыфроўцы вопытаў. Асноўнымі крытэрыямі адбору мадэлі ў іх былі прастата і ***хараство*** структуры. Малекула павінна была быць прыгожай. Непрывабныя, хоць і дастаткова лягічныя мадэлі, адкідвалі. У выніку — адкрыцьцё падвойнай сьпіралі, простай і дасканалай сістэмы малекулы ДНК.

Вельмі дакладная інтуіцыя. Вучоныя зразумелі, што шукаюць адну з ***асноваў*** існаваньня жывога сьвету і яна павінна валодаць якасьцямі існасьці.

* * *

Гэтыя пункцірныя развагі я зрабіў дзеля таго, каб падвесьці да тлумачэньня, што ***фэнамэн стваральнага эстэтычнага працэсу ў калектыўнай творчасьці людзей падпарадкаваны ўсеагульнаму сусьветнаму парадку рэчаў і ёсьць яго вобразным выяўленьнем***.

Менавіта таму тут няма брыдоты, паскудства, дэкадэнства, пачварнасьці, збачэнства думак, духу сьмерці, упадку і разбурэньня, як гэта часта прысутнічае ў індывідуальным прафэсійным мастацтве. Я не кажу ўжо пра масавую культуру.

Калі меркаваць па якасьці, узроўні і вобразнай сутнасьці эстэтычнага адлюстраваньня народнага духу і народнай адметнасьці, як выяўлена гэта ў аўтэнтычнай калектыўнай творчасьці людзей, то, безумоўна, — гэта вяршыня. ***Нішто і ніхто лепш не выяўляе хараство народу, як сам народ у сваёй традыцыйнай мастацкай творчасьці.*** Вядучыя мастацтвы тут — сьпевы і танцы.

Тым часам індывідуальная (прафэсійная) творчасьць гэта ёсьць ***мастацтва нацыі***. Вядучыя мастацтвы тут — літаратура і тэатр. Яны адлюстроўваюць жыцьцё, дух і вобраз народа праз лёсы і вобразы ***асобных людзей***.

Літаратура і тэатр ёсьць сутнасныя атрыбуты нацыянальнай культуры. (Бязь іх нацыя не ўтвараецца і не існуе.) Нацыянальнае мастацтва, як правіла, абапіраецца на народную творчасьць і выпрацоўвае плённую форму выкарыстаньня, галоўным прынцыпам якой ёсьць павага і захаваньне традыцыяў.

* * *

Разгледзім некалькі прыкладаў.

Калі ў пачатку 70-х гадоў голасна заявіў пра сябе ансамбль „Песьняры”, нашае пакаленьне маладых беларусаў успрыняло яго зь вялікай прыхільнасьцю і энтузіязмам. Тым часам ***Рыгор Раманавіч Шырма*** — найвялікшы аўтарытэт у беларускай музыкалёгіі і знаўца народнай музыкі — даволі стрымана аднёсься да іхняе творчасьці. Ён перажываў, што ў „Песьняроў” страчана глыбіня, народны беларускі дух і тонкая эстэтыка традыцыйнае песьні. У гэтым Рыгор Раманавіч, безумоўна, меў рацыю. Але ён не крытыкаваў калектыў публічна. Маэстра разумеў, што „Песьняры” і не прэтэндавалі на народнае выкананьне народных песьняў. Яны рабілі свае аранжыроўкі ў межах свайго стылю і выконвалі ўсё на выдатным прафэсійным узроўні. Народную традыцыю гэта не псавала, бо тут не было яе падмены.

Гэта прафэсійная творчасьць ***на падставе*** народнай творчасьці. Тут ёсьць своеасаблівы „гістарызм” (як нэаготыка ў архітэктуры), выяўленьне тэатральнасьці і прадстаўленьне народнага сродкамі мастацкай фантазіі. Пры такім падыходзе ўсё вырашае густ і майстэрства сьпевакоў. Падыход эстэтычна апраўданы, хоць і не глыбокі.

Цяперака паўкультурнае асяроддзе ў Нью-Ёрку якраз цікавіцца Ванэсай Мэй. Безумоўна, што яе аранжыроўкі клясыкі пад сучасныя

рытмы і выкананьне зробленыя таленавіта, на добрым узроўні і слухаюцца лёгка. Але гэта ўжо ня клясыка. Гэта другасная творчасьць. І Ванэса не хавае гэтага. Клясыцы такое ня шкодзіць. (Хоць зразумела, што тут звычайны амэрыканскі бізнэс).

Горшая сітуацыя, калі размежаваньня няма, калі на сцэну цягнуць жывую традыцыйную творчасьць, але падпраўляюць яе, „паляпшаюць” ды прерайначваюць, дадаюць „нестаючыя элемэнты” і ўсё гэта выдаецца за народны беларускі аўтэнтычны падыход. Тут зьяўляецца ашуканства, эстэтычная дэзінфармацыя. Дрэнны варыянт — гэта так званая „самадзейнасьць” зь яе апрацоўкамі народных песьняў савецкімі кампазытарамі. Тут адкрытае разбурэньне традыцыі і падмена яе прымітыўным „вакалам” („медленно, протяжно”).

Але поўнае варварства, калі малаадукаваныя культработнікі шырокага профілю вучылі „правільна сьпяваць” народных сьпевакоў, цягаючы іх па розных раённых і абласных аглядах мастацкай самадзейнасьці.

Можна ўявіць, што сталася б з бурацкім ці тувінскім гарлавым сьпевам, ці з азербайджанскім мугамам, ці з грузінскім шматгалосьсем, калі б іхных сьпевакоў павучылі савецкія культработнікі.

У Беларусі захавалася арыгінальнае прасторавае грудное сьпяваньне, заснаванае, як і ўсё старажытнае народнае, на пентатоніцы, бяз ладавай афарбоўкі мэлёдыі. Але ў Беларусі савецкія культмасавікі, што ня ведалі часам элемэнтарных рэчаў, „вучылі” народных майстроў „правільнаму вакалу”.

Разбурэньне сьпеўных і выяўленчых традыцыяў ішло за саветамі праз сцэну, самадзейнасьць, радыё і тэлебачаньне. Асноўны вынік гэтай дзейнасьці — стварэньне прымітыўных уяўленьняў пра беларускую народную культуру і стварэньне сцэнічнага паказнога кіча. Аднак самы традыцыі і народная творчасьць жыла не на сцэне і ніколі не існавала на сцэне. Звужалася і зьнішчалася таксама натуральнае асяроддзе і ўмовы існаваньня традыцыяў беларускага народнага мастацтва.

* * *

Для таго каб у грамадзтве адбывалася цягласьць народнай культуры, каб з пакаленьня ў пакаленьне перадаваліся традыцыі, неабходна, каб існавала ***пастаяннае насельніцтва на пастаяннай тэрыторыі***. Маецца на ўвазе ня толькі агульнанацыянальны маштаб, але і макрасістэмы ў межах геаграфічных мясьцінаў, адміністрацыйных раёнаў і асобных паселішчаў.

Жыхары паселішча, што існуюць у сфэры нацыянальнай і мясцовай традыцыйнай культуры, жывуць адначасна і ў сваім макрасьвеце, дзе абкультураныя ня толькі дачыненьні паміж людзьмі, але і ўся акаляючая прастора. Як правіла, кожная дарога, лагчына, камень у полі, ручайкі і рэкі, дрэвы і ўзгоркі, лясы ды палі, масты ды грэблі, крыжы пры гасьцінцы — усё мае свой назоў, сваё слова і сваю гісторыю, адлюстраваную ў памяці пакаленьняў вёскі, хутару, горада ці мястэчка.

Сацыяльна-культурнае жыцьцё паселішча — гэта таксама свая гісторыя і свой сьвет, дзе адбываюцца адметныя падзеі, існуюць адстояныя зьявы і дачыненьні. Тут пастаянна жывуць і нараджаюцца людзі. У іхняй памяці і на іх трымаецца тое, што рабілі, ведалі, стваралі дзяды і прадзеды і пяроймуць потым дзеці і ўнукі. Уся краіна пад вялікім дахам нацыянальнага адзінства складаецца з такіх макрасьветаў і асяродкаў.

Усё спыняецца, калі зьнікаюць носьбіты макраінфармацыі, калі адбываецца замена насельніцтва. Усялякая гвалтоўная масавая міграцыя нават у межах невялікіх тэрыторыяў небясьпечная для традыцыйнай культуры.

Камуністы праводзілі русіфікацыю і рыхтавалі ператварэньне людзей у савецкі народ, штучна перамешваючы насельніцтва. ***Чарнобыль для Беларусі — гэта ня толькі сацыяльна-экалягічная бяда, але і культурная катастрофа.*** (Маецца на ўвазе страта пастаяннага насельніцтва ў чарнобыльскай зоне.)

Гістарычны вопыт засьведчыў, што людзі на ўзроўні народнай культуры, калі яны адарваныя ад сваёй тэрыторыі і памешчаныя ў іншай, нават блізкай, культурнай супольнасьці, нават трымаючыся кампактна, як правіла, трацяць свае традыцыі і асімілююцца іншым асяроддзем (найдаўжэй — на працягу некалькіх пакаленьняў). Выключэньне складаюць толькі некаторыя народы, мэнтальнасьць якіх абапертая на высокія традыцыі старажытнай культуры, адлюстраванай у помніках пісьмовасьці. Гэта, перш за ўсё, габрэі, кітайцы, у меншай ступені — індусы, карэйцы і арабы.

* * *

Калектыўнае народнае мастацтва, заснаванае на традыцыі, спарадзіла і пакінула шмат фэнамэнальных зьяваў творчасьці. Зьвернем увагу, напрыклад, на архітэктуру готыкі. Шмат якія мастацтвазнаўцы лічаць архітэктуру готыкі цудам чалавецтва, вяршыняй дойлідства. Тым часам гатычная архітэктура ў поўным сэнсе ёсьць народнае рамяство і народнае мастацтва. Яго стварыў народ, рамесьнікі, арганізаваныя ў цэхі, якія зьберагалі традыцыі і таямніцы свайго мастацтва і якое майстры перадавалі з пакаленьня ў пакаленьне. Прафэсійныя (індывідуальныя) архітэктары, што займаліся адным праектаваньнем, зьявіліся пазьней, ў пэрыяд рэнесансу ў Італіі.

Фэнамэнальнай зьявай ёсьць кітайская клясычная паэзія (і зьвязаная зь ёй японская).

Кітайскаму вершаскладанству ўжо тры тысячы гадоў. Гэта індывідуальная творчасьць прафэсійных паэтаў, хоць вершы ў Кітаі вучылі складаць кожнага адукаванага чалавека і кожны дзяржаўны чыноўнік умеў іх пісаць. Тут скарбы трохтысячагадовай кітайскай паэтычнай культуры (зь якой карысталі ўсе пакаленьні), і моцная сіла традыцыяў.

Японцы вытанчылі паэтычную музу, сягнулі ў сутнасьць рэчаў і глыбіню душы, кананізавалі формы вершаў, як музычны акорд: танка — пяць радкоў, злучаныя строфы; хоку — тры радкі. І ні ўлева, ні ўправа: вялікае ў малым.

Тут вольная індывідуальная творчасьць у жорсткай традыцыі. Тым часам такія ўстаноўкі для самавыяўленьня стварала толькі калектыўная народная творчасьць.

Фэнамэн кітайскай і японскай паэзіі вядомы ў сьвеце. Ён ставіцца вельмі высока. І калі я падумаю пра гэта — агортвае мяне нейкая бясьсільная маркота, нібы ад прадчуваньня вялікага марнатраўства.

Бо ёсьць яшчэ адзін незвычайны сінтэтычны (г.зн. злучаны зь некалькі мастацтваў) фэнамэн творчасьці на ўзроўні вяршыняў чалавецтва — сплаў дзівоснай музыкі і вялікай паэзіі. Гэты фэнамэн — ***беларускі песенны фальклёр***, зьява ўнікальная ў Эўропе.

Але хто ведае пра гэта! Я часта быў сьведкам, калі людзі не маглі яго зразумець, усяроўна, як тыя, што не навучаныя слухаць душой, ня ўмелі ўспрымаць клясычную музыку, ці як тыя (прывыклыя да эўрапейскай шматслоўнай паэзіі), што няўцямна гарталі Сайгё, Бусона, Ісу ці Басё.

За апошнія 40 гадоў выдадзена больш за паўсотні акадэмічных тамоў паэтычных тэкстаў беларускага фальклёру. Справа ня ў тым, што ні ў каго такога няма, што гэтае неверагоднае народнае багацьце (хоць сабранае, на жаль, аднабакова) ёсьць толькі рэшткі з таго, што засталося, што гэтая веліч паказвае на велізарную культуру, якую 200 гадоў адмыслова разбуралі і зьнішчалі варвары. Справа ў тым, што ***гэта ёсьць сусьветны ўзровень***, паэтычная энцыкляпэдыя, філясофія духу, гісторыі, побыту, характару і вобразаў хараства беларускага народу, як частка Боскай ісьціны і Боскай красы.

Хто ведае, хто разумее гэта ў эпоху рэгрэсу і дэградацыі эўрапейскай культуры! Адказ „хто” ды „чаму” ляжыць на паверхні. Толькі я ня буду яго паўтараць. Мы жывем у такім становішчы і ў такую пару, калі кожны да Беларусі прыходзіць сам.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***кандыдат мастацтвазнаўства***

*2 красавіка 2001 г.*
*Нью-Ёрк*

# ХРАНІЧНАЯ ФОРМА...

Расейская ваенная пракуратура ўвесь час разсылае гончыя лісты і расшуквае летувіскіх „дызэртыраў”, што ўцяклі з савецкай арміі ў Летуву ў 1990-91 гг. Летувіская газэта „Lietuvos Rytas” піша, што паліцыя ў Панявежы атрымала 18 жніўня (у 10-ю гадавіну камуністычнага путчу ў Маскве) гончы ліст з патрабаваньнем арыштаваць Дарыюса Келяса, які ў лютым 1990 г., даведаўшыся, што Летува шыкуецца да аб’яўленьня незалежнасьці, уцёк з савецкай арміі. У той час, згодна з пастановай Летувіскага парляманту, дзясяткі летувісаў уцякло з савецкага войска, альбо ўхілілася ад пабору.

Прадстаўнік летувіскай пракуратуры Відмантас Пуцеліс паведаміў, што толькі ў гэтым годзе расейская пракуратура прыслала больш за 20 гончых лістоў з просьбай аб арышце савецкіх „дызэртыраў”.

Той, хто быў пад саветамі, ведае розьніцу паміж хранічным ідыятызмам і невылечным імпэрыялізмам. (Там, дзе ў адных клініка, ў іншых — палітыка.) Таму Пуцеліс сур’ёзна запэўнівае, што „ўцекачы” могуць спаць спакойна, ніхто іх расейцам выдаваць не зьбіраецца.

*(З газэтаў)*

# РАСЕЯ: 14 ЛІТРАЎ НА ДУШУ

Расейска-амэрыканская газэта „В новом свете” *(30 сакавіка—5 красавіка 2001)* падала новыя дадзеныя аб спажываньні моцнага алькаголю ў Расеі. На кожную душу ў Расеі (уключаючы старых і немаўлят) прыходзіцца 14 літраў моцнага алькаголю ў год. Тым часам экспэрты Сусьветнай Арганізацыі здароўя вызначылі, што спажываньне 8 літраў моцнага алькаголю на душу ў год зьяўляецца крытычным для чалавечай папуляцыі (нацыі). Па-за гэтым парогам пачынаецца незваротны працэс выраджэньня грамадзтва.

У структуры спажываньня алькагольных напояў у Расеі піва займае больш 13%, віно 6-7%, гарэлка — 80 %. Ніхто на сьвеце не п’е моцнага алькаголю ў такой колькасьці. 40% мужчынаў і 17% жанчынаў у Расеі рэгулярна п’юць гарэлку.

Сярод алькаголікаў шмат дзяцей і падлеткаў. 25% паміраньня жыхароў напрасткі альбо ўскосна зьвязана з ўжываньнем алькаголю. За 2000-ны год ад вострага атручваньня алькаголем у Расеі памерла 31 тысяча чалавек. Вельмі павялічылася колькасьць нараджэньня людзей з прыроджанымі калецтвамі.

Трэба сказаць, што ў Расеі заўсёды пілі вельмі шмат алькаголю. Працэс парогавага накапленьня там расьцягнуты ў часе.

У Беларусі рэзкае павелічэньне ўжываньня алькаголю назіралася ў пачатку XX стагоддзя, потым за бальшавікамі — перад вайной і асабліва — за брэжнеўшчынай у 70-х гадах мінулага стагоддзя. Аднак нішто не параўнальна з цяперашнім цёмным часам. За пэрыяд існаваньня Лукашэнкі ва ўладзе п’янства ў Беларусі стала афіцыйнай палітыкай рэжыму. Колькасьць спажываньня алькаголю за гэты кароткі час павялічылася ў два разы, зрабіла катастрафічны скачок і дасягнула11 літраў алькаголю на беларуса.

Ніколі ў Беларусі не было такога п’янства. Народ у небясьпецы.

***Мар’ян ВАНЬКЕВІЧ***

# БЕЛАРУСКІЯ ГАЛАСЫ

## *„Адзін вусаты твар”*

Доўгі час я працаваў у Цюмені і быў адарваны ад беларускіх рэаліяў. Цяпер вярнуўся ў Беларусь і нібыта трапіў у мінулае. Беларускае тэлебачаньне горш, чым савецкая прапаганда. Адна лаянка і бруд, ніякіх навінаў. На экране ўвесь час адзін вусаты твар.

Няўжо беларусам яшчэ нешта не зразумела? А калі зразумела, чаму церпяць? Чаму моўчкі назіраюць за гэтым сьмешным так званым „усебеларускім сходам”, які аплочаны зь іх жа кішэні? Раз церпяць, значыць, вартыя такіх кіраўнікоў і такога жыцьця.

Млосна, бо гэта ж мой народ, мая радзіма. Але жыць у гэтым балоце, працаваць за мізэрныя грошы і яшчэ цярпець такую ўладу — не, я не самазабойца. Давядзецца зноў ехаць у Расею. Думаю, разумныя людзі даўно адсюль зьехалі, а хто ня зьехаў — няхай спажываюць тое, што заслужылі сваім выбарам.

***Мікола Лемяшонак** (2-3 чэрвеня, Рэчыца)*




(„Ніва”)

***Чарговая „мова” новых былых: „Дую сьпік Беларэйшан?”***

## *Падмурак — незалежнасьць*

Васіль Лявонаў, калі казаў пра свой рух „За новую Беларусь”, назваў тры асноўныя мэты: даць людзям волю, зрабіць іх жыцьцё эканамічна нармальным і пазбавіць Беларусь ад дыктатуры. І ніводнага слова пра тое, ці будзе Беларусь незалежнай, ці захавае свой суверэнітэт.

А гэта ж самае галоўнае, што хвалюе цяпер моладзь і ўсіх людзей, якія хочуць зьменаў.

Аб’яднаньне грамадзтва, да якога заклікае Лявонаў, магчыма толькі на гэтым падмурку. Усё астатняе — падман і пустазвонства. Шкада, што такі чалавек, як Лявонаў, узначаліў выбарчы штаб Ганчарыка. Усім памятны час, калі камуністы абяцалі райскае жыцьцё. Але — толькі абяцалі. Самы намэнклятуршчыкі стварылі для сябе свой „камунізм” і жылі пры ім добра. Цяпер яны зноў хочуць туды трапіць, толькі ўжо пад іншымі лёзунгамі.

***Язэп Бульба** (11 жніўня, Жабінка)*

## *Чаму вы не гаворыце па-беларуску?*

Апраўдваючы ўласную бяздзейнасьць, мы ўвесь час вінавацім Лукашэнку, апазыцыю, Захад, Крэмль, але толькі не сябе. Чакаем свабоды і незалежнасьці, лепшага жыцьця і дэмакратыі, не высоўваючы носу са сваіх кватэраў.

На Беларусі бясьследна зьнікаюць вядомыя палітыкі. Апублікаваныя дакументы, якія даказваюць дачыненьне ўлады да гэтага. Першыя асобы не абвяргаюць іх, не ствараюць камісію дзеля расьсьледваньня гэтых фактаў.

Чаму, калі Лукашэнка топча ўсё нацыянальнае, у тым ліку і мову, мільён нязгодных зь ім беларусаў не размаўляе дэманстратыўна па-беларуску, ня носіць на грудзёх ля сэрца нацыянальныя сымвалы?

Выбачайце, калі ласка, даражэнькія мае беларусы, мяне, расейца з-пад

Варонежа, але гэта не памяркоўнасьць і не талерантнасьць, а зусім іншае: баязьлівасьць і халуйства перад уладай.

***Уладзімер Феакцістаў** (11 жніўня, Менск)*

*(Паводле радыё „Свабода”)*

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(па матэрыялах „Народнай Волі”, „Пагоні”, „Нашай Свабоды”, SANA; травень-чэрвень 2001 г.)*

■ Паводле статыстыкі Міждзяржаўнага статыстычнага камітэту СНД, у лютым 2001 г. у Беларусі быў адзначаны рост спажывецкіх цэнаў у СНД у параўнаньні са сьнежнем 2000 г. Гэты паказчык склаў у Беларусі 8,8%: на харчовыя тавары —8,4%, нехарчовыя тавары — 5,5%, паслугі — 16,5%. А ў Расеі спажывецкія цэны вырасьлі на 5,1%, у Таджыкістане — на 3,7%, у Грузіі — на 1,3%.

■ ***Уладзімер Кулажанка**, доктар эканамічных навук, прафэсар*. Як ні інструктуй двух жабракоў, ні кожны зь іх, ні два разам багатымі і моцнымі ня стануць. Расея, дзе ВУП амаль удвая меншы за ВУП востраў Тайвань, ня можа даць Беларусі ні новыя тэхналёгіі, ні вялікія крэдыты. Апроч крымінальнага капіталу — нічога. Да таго ж аб’ём зьнешнегандлёвага таваразвароту паміж Расеяй і Беларусьсю ў лепшым 1997 г. зьменшыўся да 9,5 мільярдаў даляраў, ці ў тры разы, у параўнаньні з 1991 г., калі ён дасягаў 29 мільярдаў даляраў. Былы сьпікер так званага „парляманцкага сходу” **Малафееў**, якога нельга западозрыць у аньцінтэграцыйных настроях, нядаўна паведаміў у друку, што некалькі год таму колькасьць прыхільнікаў інтэграцыі дасягнула ў Беларусі нібыта аж 80%, а летась гэтая лічба зьляцела ніжэй 50%. Але ёсьць адна галіна, дзе інтэгратары дасягнулі вялікіх посьпехаў. Гэта супрацоўніцтва ў ваеннай справе. Сам па сабе **небясьпечны факт, што каля 200 расейскіх ваенных прадпрыемстваў устанавілі і разьвіваюць тэхналягічныя сувязі са 120 аб’ектамі беларускага ВПК**.

■ Па колькасьці самагубстваў Беларусь наблізілася да звышвысокага паказчыку: калі ў 1999 г. узровень суіцыду склаў 28,7 выпадкаў на 100 тысячаў насельніцтва, то летась — ужо 30,6. Усяго ж у 2000 г. ў Беларусі зафіксаваныя 3000 самагубстваў.

■ За 2000 г. у Беларусі на сухоты захварэла 4.869 чалавек і 638 чалавек ад гэтай хваробы памерлі. Агульная колькасьць сухотнікаў у краіне — 23.000 чалавек. Сярод іншых краінаў Беларусь займае па гэтай статыстыцы адно з першых месцаў (!). У 1999 г. паказчык захворвальнасьці на 100.000 насельніцтва склаў 67,1 чалавекі (у Чарнобыльскай зоне — 120 чалавек), у Расеі — 82,3 чалавекі, у Нямеччыне, Вялікабрытаніі і Францыі — 10-13 чалавек. Эпіцэнтрам хваробы зьяўляюцца турмы. Там паказчык захворваньня ў 30 разоў перавышае паказчык у цэлым па краіне: у 2000 г. — 1362 хворыя на 100 тысячаў асуджаных, у 1999 г. — 1402 хворыя. Усе хворыя пераводзяцца ў спэцкалёнію у Воршы, якая перапоўненая і мае каля 2000 хворых на сухоты.

■ Пабіты рэкорд Керанскага. У 1917 г. у Расеі часоў Керанскага пачка запалак каштавала 1 мільён рублёў-керанак. У Беларусі за апошнія 7 гадоў за час Лукашэнкі былі праведзеныя ўжо дзьве дэнамінацыі рубля, ад якога аднялі шэсьць (!) нулёў. Значыць, у нас *дэ факта* пачка запалак каштуе 12 мільёнаў рублёў. Рэжым пабіў усе сусьветныя рэкорды.

■ Прэс-служба амбасады Рэспублікі Польшча ў Беларусі распаўсюдзіла заяву, у якой гаворыцца: „19 красавіка 2001 г. першы нацыянальны канал беларускага тэлебачаньня прадставіў гледачам праграму І. Рудамётава „Эксгумацыя нянавісьці”, у якой была ўзята пад сумнеў балючая гістарычная праўда аб злачынствах, зьдзейсьненых НКВД у 1937-41 гг. у Курапатах пад Менскам. Выступаючы ў тэлеперадачы, псэўдаэкспэрты надзвычай цынічна адмаўлялі той факт, што спраўцамі забойстваў беларусаў, палякаў і парадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў зьяўляліся сталінскія каты. Аўтары праграмы выкарыстоўвалі прэпарыраваныя „доказы” і, насуперак элемэнтарнай лёгіцы і прынцыпам добрасумленнай журналістыкі, распаўсюдзілі хлусьню, становячыся такім чынам прадаўжальнікамі самых змрочных прапагандысцкіх традыцыяў сталінізму. У сувязі з гэтым мы хочам нагадаць, што ***публічнае аспрэчваньне генацыду зьяўляецца практыкай, якая асуджаецца цывілізаваным сьветам, а ў некаторых выпадках перасьледуецца па закону. Той, хто сьвядома абараняе катаў, становіцца побач зь імі ў адзін шэраг і адначасова зьмяшчае сябе па-за межы этычных нормаў***”.

■ *13 траўня Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* быў узьняты над Берасьцем. Сьцяг лунаў на самым высокім будынку на вул. Савецкай, на апошнім паверсе 15-павярховага гатэлю. ***Мірон*** працягвае дзейнічаць.

■ Прыход да ўлады Лукашэнкі прывёў да рэзкага скачку сьмяротных прысудаў у Беларусі. Лукашэнка не памілаваў за гады свайго кіраваньня аніводнага злачынцу. За гэты час было расстраляна 126 чалавек.

■ Агульнанацыянальную акцыю пад назовам „Горад — наш!” правёў у ноч з 13 на 14 траўня *Малады Фронт.* ***По ўсёй Беларусі былі вывешаныя 120 Бел-Чырвона-Белых сьцягоў.*** Такім чынам была адзначаная шостая гадавіна ганебнага рэфэрэндуму 1995 г. Сьцягі вывешваліся на рынках, вакзалах ды ў іншых людных месцах.

■ Працягваецца масавы зыход беларускіх спартоўцаў пад сьцягі іншых краінаў. Пра намер пакінуць Беларусь паведаміла днямі чэмпіёнка сьвету па велатрэку Натальля Маркаўнічэнка, якая зьяжджае ў Расею. Сваё рашэньне яна патлумачыла палітычнай нестабільнасьцю ў Беларусі. Яна зазначыла: пара задумацца пра будучыню. Апошнім часам Беларусь страціла цэлую плеяду як маладых, так і заслужаных спартоўцаў. Вось толькі невялікі пералік беларускіх майстроў, што працуюць цяпер за мяжой: Барыс Гельфанд (шахматы; Ізраіль), Зьміцер Макараў (скачкі з шостам; Аўстралія), Эдуарда Хамэляйнэн (дзесяцібор’е; Фінляндыя), Юлія Сіняк (стральба; Расея), Ганна Смашнова (тэніс; Ізраіль), Юлія Ваткіна (гімнастыка; Аўстралія), Мадзіна Бігтагірава (лёгкая атлетыка; Расея).

*17 траўня.* Цікавыя прызнаньні ў інтэрв’ю радыё *Рацыя* зрабіў Георгій Яўлінскі, лідэр расейскай партыі „Яблоко”: „Я мяркую, што Пуцін на выбарах у Беларусі можа падтрымаць каго-небудзь іншага. І такое цалкам можа здарыцца”.

Журналіст: — Якія ў Крамля будуць крытэрыі адбору?

Яўлінскі: — Паслухмянасьць, ляяльнасьць. Можа быць, меншая ўплывовасьць.

*20 траўня.* Прэзыдэнт ЗША Джордж Буш і фэдэральны канцлер Нямеччыны Гэрхард Шродэр дасягнулі тайнай дамоўленасьці не рабіць Маскве фінансавай дапамогі ў сувязі з тым, што аб’ёмы вывазу капіталу з Расеі дасягаюць вялікіх памераў. Пра гэтую сэнсацыю паведамілі нямецкія часопісы *Der Schpiegel* і *Focus* са спасылкай на дадзеныя сакрэтнага мэмарандуму, складзенага нямецкім амбасадарам у Вашынгтоне . „Канцлер пагадзіўся з Бушам, што фінансавая дапамога Маскве ня можа быць зробленая, пакуль вялізныя сумы вывозяцца з Расеі за мяжу”, — цытуюць часопісы сакрэтны дакумант. Акрамя таго, Буш таксама крытыкаваў Расею за пастаўкі ўзбраеньняў Ірану і раіў прыпыніць эканамічную дапамогу Маскве да тае пары, пакуль ня будзе магчымасьці больш дэталёва прааналізаваць палітыку і мэты Пуціна.

■ Адвакат сям’і чачэнскай дзяўчыны ***Эльзы Кунгаевай***, у забойстве якой абвінавачваецца расейскі палкоўнік **Буданаў**, сцьвярджае, што расейскія вайскоўцы закапалі яе яшчэ жывой. Такую заяву адвакат ***Абдула Хамзаеў*** зрабіў на судовым працэсе ў Растове-на-Доне падчас допыту малодшага сяржанта *А.Ягорава*, падначаленага забойцы. Другі вайсковец-сьведка *Грыгор’еў* пацьвярджае, што камандзір палка правёў з дзяўчынай дзьве гадзіны. Калі Грыгор’еў увайшоў да камандзіра, дзяўчына не выяўляла прыкметаў жыцьця. Буданаў загадаў вайскоўцам загарнуць яе цела ў посьцілку і закапаць.

■ У расейскіх дзяцей пачалі часьцей выяўляцца псіхічныя адхіленьні. Каля аднаго мільёну дзяцей да 17 гадоў цяпер знаходзяцца пад наглядам псіхіятра. Псіхічныя хваробы зьяўляюцца адной з галоўных прычынаў

вызваленьня юнакоў ад службы ў войску, непасьпяховасьці ў вучобе. На думку спэцыялістаў, гэтаму спрыяюць неадэкватныя вучэбныя праграмы, якія надта перагружаюць дзіцячую псіхіку. За апошнія 5 гадоў частата псіхічных адхіленьняў у дзяцей да 14 гадоў павялічылася на 16,7%. У асобных рэгіёнах парушэньні псіхікі маюць да 17% дзяцей. Больш за палову выпадкаў прыходзіцца на разумовую адсталасьць, каля 6% пакутуюць на псіхозы, 2% — на шызафрэнію. А псіхатэрапэўтычная дапамога знаходзіцца ў крытычным стане. З 1995 г. адменена пасада дзіцячага і падлеткавага псіхіятара, бракуе спэцыялізаваных лячэбных установаў. Хворыя атрымліваюць састарэлыя прэпараты, якія даюць сур'ёзныя пабочныя эфэкты.

■ 21 траўня прэм'ер-міністар Арменіі ***Андранік Маркаран*** выступіў супраць далучэньня Арменіі да саюзу Расеі і Беларусі. Ён заявіў, што ратаваньне і росквіт Арменіі залежаць не ад уступленьня ў які-небудзь саюз, а ад дзейнасьці прэзыдэнта, урада і парляманту краіны. Ён падкрэсьліў, што „сёньня саюз Расеі і Беларусі заняты сваімі невырашальнымі праблемамі". Сваю заяву Маркаран зрабіў праз два дні пасьля правядзеньня ў Ерэване мясцовай кампартыяй мітынгу ў падтрымку далучэньня да „саюзу". Армянскія камуністы ініцыявалі нечарговае паседжаньне парляманту па пытаньні правядзеньня рэфэрэндуму аб далучэньні Арменіі да „саюзу". .

***Валеры БУЙВАЛ***

# BELARUSAN CHOICE

*(Statement)*

Lukashenka regime has appointed four pretenders to be included into the ballot-paper on September 9, 2001. All these persons are oriented to Moscow and dependent from Russia. Because of that all the candidates are completely suitable for Moscow.

The Cremlin is controlling not only the Lukashenka regime. Russia has reanimated the Kebich nomenclature group and formed of it the opposition to Lukashenka. Russia has been helped to do it by some of the Western diplomats, in the first place by Mr. H.-G. Wieck.

Mr. Uladzimer Hancharyk and Mr. Syamyon Domash have been appointed to head the group of the nomenclature opposition. They go regularly to Moscow in order to use its support and to return to the power. They promise as compensation to strength the union of Russia and Belarus, to make it more close than under Lukashenka. They are acting as intermediaries in the process of the formation by Moscow of conditions for the directed political conflict in Belarus.

Under Lukashenka the power in Belarus has been seized by the Russians – KGB functionaries, generals and colonels, which came from Russia. This pro-Moscow occupation regime is suppressing and annihilating everything Belarusan in Belarus: language and culture, school and state institutions, economy and business. National symbols – coat of arms „Pahonya" and white-red-white flag – have been illegally and brutally prohibited as Belarusan state symbols.

Lukashenka regime has caused the catastrophic pauperization of people – the major part of the population lives under the living wage and can only survive. At the same time the regime is carrying out the hidden redistribution of the national property in favour of Russian politicians and oligarchs.

The pro-Moscow regime has a main aim – to annihilate the Belarusan independence and state, to seize the national property and to transform our country into the region of the Russian empire. This is made by Lukashenka's consent. Because of that the old Kebich nomenclature would like to return to the political scene and power in order to continue the policy made under Lukashenka.

Mr. S. Haydukevich is acting as ally and actor dubbing a part of Lukashenka in this electoral campaign. He has been included into this scenario by the Moscow specialists of political technologies.

The nomenclature composition Hancharyk-Domash inder the title „unique candidate" of the so-called „united democratic opposition" doesn't represent the alternative to the pro-Moscow policy of Lukashenka. This composition is participating in the electoral campaign with the main aim – to seize the power in Belarus with the help of Moscow and to redistribute the property in favour of its masters. It is obvious that the „unique candidate" is not interested to carry on the political and economical reforms in favour of Belarusan people. He ought satisfy the interests of the Moscow financial and political masters and of the Belarusan former communist Soviet nomenclature.

The communist Soviet nomenclature has selected politicians, which had renounced the national idea and national liberation struggle going over to the Wieck's „united democratic opposition" in 1999. Some of the national conscious persons have joined this „opposition" because they have been deceived by its pseudo-democratic phraseology. Nowadays they are using all the arguments to excuse their hasty transfer to the staff of the leader of the „school of communism" Mr. Hancharyk. They are dragging their political adherents into this political swamp.

In these circumstances the Soim of the Conservative Christian Party – BPF appeal to the citizens of Belarus to participate in the elections on September 9, 2001. It is necessary to vote on the first and second round against all the persons included into the ballot-paper. In this case nobody would be elected and the new election have to be launched in the next three months in accordance with the actual law. A new electoral situation would arise because Lukashenka will lose his plenary powers on November 27, 2001 in accordance with his constitution. The new Belarusan candidates would be presented on the new elections.

This action is right and necessary, it is the essence of Belarusan choice. We will defend the Belarusan independence, Belarusan Rebirth and secure the political perspective of the Belarusan nation.

***Adopted by the Soim of the Conservative Christian Party – BPF***

*(Пераклад зь беларускай мовы В.Буйвала)*

*August 18, 2001*

**ГАЛАСУЙЦЕ СУПРАЦЬ ЎСІХ!**
***БО ВЫБІРАЦЬ НЯМА КАГО!***
**ПАТРЭБНЫЯ НОВЫЯ ВЫБАРЫ.**

**ГАЛАСУЙЦЕ СУПРАЦЬ ЎСІХ!**
***БО ВЫБІРАЦЬ НЯМА КАГО!***
**ПАТРЭБНЫЯ НОВЫЯ ВЫБАРЫ.**

**ГАЛАСУЙЦЕ СУПРАЦЬ ЎСІХ!**
***БО ВЫБІРАЦЬ НЯМА КАГО!***
**ПАТРЭБНЫЯ НОВЫЯ ВЫБАРЫ.**

Беларускія Ведамасьці
Беларускае выданьне
У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**